Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

1931
XVIII

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

КАСТРЫЧНІК
ЛІСТАПАД
№ 20 - 21

Днепрапятроўскі завод мэталюргічнага абсталяваньня

На здымку: агульны выгляд работ на аднаўленьні домны



Зьмест: Фабрыка чалавекаў — С. Бройдэ. Кастрычніцкае слова — Т. Алесік. Андрэй Шышкоў—П. Броўка. Камунар—Т. Курбацкі. Адзін з многіх— Юр. Лявонны. Біографія байца—П. Швэйдэль. Песьня пра паравоз—Юр. Бітус. Перамога на пуцях—С. Галаеў. Лесатэхнічны інстытут у Гомелі. Я. Вястовіч. Бібліографія. Шахматы.

Выданьне Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі. Рэдактар МІХАСЬ ЧАРОТ

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная Беларусь

XVIII

1931

Кастрычнік Лістапад № 20-21



Забясьпечым датэрміновы пуск Уралмашбуда



На будоўлі сталяліцейнага цэху

Фабрыка чалавекаў

С. БРОЙДЭ

...У Маскве, у Таганскім папраўчым доме рашылі стварыць батальён фабрычна-заводзкага вучнёўства. Ініцыятыву ў гэтай справе праявіў пазбаўлены волі Крумінскі, які стаў першым камандзірам батальёну. Ён склаў сьпіс з 75 чалавек няпоўналетніх злачынцаў, якія павінны былі ўвайсьці ў склад батальёну. Над гэтым спачатку насьміхаліся, але Крумінскі з уласьцівай яму энэргіяй працягваў пачатую справу і к канцу 1930 году дабіўся свайго. Батальёну былі адведзены шэсьць лепшых камер у агульным корпусе, туды пастаўлены былі новыя ложкі, здабылі новыя коўдры. Пашыта была форма, па ўзору, зацьверджанаму адміністрацыяй, абмундзіраваньне было раздадзена і батальён пачаў жыць. Няпоўналетнія злачынцы, у мінулым рэцыдывісты, ва ўзросьце ад 15 да 18 год, зладзеі, кішэньнікі павінны былі даказаць, што яны ўмеюць працаваць, вучыцца і што яны, у адказ на клапоты аб сабе, пакажуць, чаго яны варты.

Абставіны, у якія яны папалі з адзіночнага корпусу, былі для іх спачатку нязвыклымі. Яны хадзілі па калідору, адчуваючы сябе чужымі. Але паступова іх уцягвалі ў масавыя гурткі, у іх выклікалі зацікаўленасьць да работы. Спадарожна ішлі практычныя заняткі па сьлесарна-кавальнай справе. Не забываліся і аб фізкультурных гульнях. Стварыліся свае: бібліятэчны актыў, санітарны гурток, шахматны гурток, гурток вайсковых ведаў і г. д.

З першага складу батальёну у мяне асабліва астаўся ў памяці рэцыдывіст Перлоў. У мінулым ён шмат разоў судзіўся. У батальёне Перлоў рэзка перарадзіўся. Хутка зьвярнуў на сябе ўвагу таварышоў і неўзабаве Перлова назначылі камандзірам батальёну ФЗВ. Уплыў Перлова на падлеткаў быў даволі прыкметны. Вучэбна-выхаваўчая частка надала шырокія поўнамоцтвы камандзіру батальёну. Перлоў меў права дадзенай яму ўладаю накладваць дысцыплінарныя пакараньні, якія ўжываліся за парушэньне правіл ўнутранага распарадку батальёну. Старыя звычкі ні разу не заўважваліся за Перловым. Ён першы канавод на рабаваньнях на волі, стаўся адным з застрэльшчыкаў грамадзкасьці ў турме. Вакол яго арганізаваўся актыў. Перлоў атрымаў водпуск на два дні на волю— гэта было рызыкоўна з боку адміністрацыі, але ён бліскуча апраўдаў давераньне. Пунктуальна праз два дні к паказанаму тэрміну падлетак Перлоў—камандзір батальёну зьявіўся ў турму. Па вучобе Перлоў ішоў адным з першых. На выпускных іспытах Перлоў атрымаў кваліфікацыю сьлёсара 5-га разраду. Вось ён прад маімі вачмі: сярэдняга росту, з ярка-рудаватымі валасамі, шэрымі выпытальнымі вачыма, складны. Мне давялося чуць ад яго таварышоў, што на волі Перлоў, праявіў вялікія здольнасьці буйнога злодзея. Ён настолькі абмеркавана складаў плян сваіх зладзейскіх спраў, што яны рэдка скончаліся нятрапна. Тым больш дзіўным здавалася перараджэньне Перлова ў турме. Спачатку ніхто ў гэта не верыў. Але з кожным месяцам Перлоў рабіўся ўсё больш замкнёным, загаварыў зусім новаю моваю. З прагнасьцю накінуўся ён на кніжкі. Яго організатарская здольнасьці, энэргія, прыродная кемкасьць і здагадлівасьць пераключыліся на вучобу. Чалавек перарадзіўся.



У майстэрні за працай



Група няпоўналетніх пазбаўленых волі

А вось і другі радавы батальёну Карталінскі,—адзін з слаўтых маскоўскіх кішэньнікаў. Гэта быў чалавек, які ўмудраўся з такой лёгкасьцю і профэсыянальнай „далікатнасьцю“ абкрадваць людзей, што выклікаў захапленьне нават у сваіх таварышоў. Быў распачліва сьмелы, і лічыўся неўлавімым Крымінальным Вышукам былі пасланы агенты, каб яго злавіць. Але пападаліся тыя, хто „працаваў“ з Карталінскім, сам-жа ён увільваў. Калі хмары згусьціліся над яго галавою і ня было такой кватэры, дзе-б за ім не сачылі, ён высьлізнуў з Масквы. Высокага росту, з агатавымі вачмі, з фігураю добрага аматара спорту, ён наўрад ці мог-бы выклікаць у каго-небудзь падазронасьць у сваёй прыстойнасьці. Адзяваўся далікатна, заўсёды быў сур'ёзны, скупа выкідваў словы. Здавалася, што гэты юнак добра выхаваны, вытрыманы, дысцыплінаваны.

Карталінскага ў канцы канцоў злавілі.

У турме ён „забузіў“. З першых-жа дзён спрабаваў згуртаваць вакол сябе групу камратаў-рэцыдывістаў. Адміністрацыі прышлося павазіцца з Карталінскім, перш чым ён згадзіўся працаваць. Уплыў яго на таварышоў быў такі вялізарны, што работа зараз-жа развальвалася там, дзе ён зьяўляўся. Зусім другім стаў Карталінскі, калі яго перакінулі ў батальён.

У яго нечакана зьявілася палкае жаданьне вывучыць аўтотрактарную справу. Але ў програме ФЗВ аўто-трактарнай справы ня было; тады ён стаў у вольны час наведваць аўтарэмонтныя майстэрні Таганскай турмы. У бібліотэцы ён прачытаў усё, што знайшоў аб аўтомобілях і трактарах. Вучыўся ў ФЗВ кавальнай справе, скончыў школу малатабойцаў па трэцяму разраду. Вучоба ў ФЗВ была для яго трамплінам да аблюбёнага аўтотрактару.

Цяпер Карталінскі працуе на заводзе „Фээзр“. Сумеў ужо праз некалькі дзён пасьля свайго выхаду на волю паступіць на аўтотрактарныя курсы.

За Карталінскім і Перловым ідзе Каралёў—бледнатвары юнак са сьветлымі валасамі, худзенькі, з глыбока ўпалымі вачыма і высокім ільбом. Ён здаваўся замкнёным, маўклівым, рэдка ўхмыляўся, адказваў дзелавіта—па-вайсковаму коратка.

Каралёў падняў дысцыпліну на славу ў сваім батальёне, што складзен з няпоўналетніх злачынцаў. Яму—камандзіру—усяго дванаццаць год.

Каралёў сумесна з Карталінскім і Перловым уваходзяць у склад штабу батальёну—гэта мозак яго. Гэта тройка трымае

моцна ў руках няпоўналетніх злачынцаў,—злодзеяў і бандытаў, якія ў ліку 150 (лічба радавых батальёну), будучы раскіданымі па Маскве, зрабілі-б ня мала бяды, а тут, у майстэрні, ціха, не шалахнуўшыся яны напружана працуюць.

Радам з Каралёвым ля варштату—15-цігадовы хлопчык, малога ўзросту, з дзіцячымі блакітнымі вачыма, запухлымі губамі і палахлівымі няўпэўненымі рухамі.

— Што робіць тут гэты юнак?—спытаў я начальніка выхаваўчай часткі.

— Спытайце яго самі. Гэта дазваляецца.

І я нясьмела задаю яму гэта пытаньне. Ён густа чырванее.

— Я па 62-му артыкулу.

— Што гэта за артыкул?

— Крадзёж.

Ён адказвае так неахвотна, што мне нялоўка задаваць далей пытаньні.

— Я свой—такі-ж, як і ты тут,—тлумачыў я яму.

— Дык нашто тады пытаць, што табе да гэтага,—вочы бліснулі злосна.

Рэзкі адказ надоўга адбіў у мяне ахвоту гутарыць на гэту тэму з пазбаўленымі волі.

— У нашай турме,—тлумачыў мне Пронкін (кіраўнік вучэбна-выхаваўчай часткі),—набіраецца значная колькасьць падлеткаў—рэцыдывістаў. Раней яны пападалі тут у абставіны спрыяючыя яшчэ большаму разлажэньню іх, яшчэ больш узмацняючыя іх соцыяльную распусту, а цяпер аддзяленьне для няпоўналетніх у нас арганізавана ў выглядзе закрытай школы ФЗВ. Комплектаваньне яе адбываецца пры дапамозе мэдыцынскага і псыхо-тэхнічнага адбору. На працягу 1—1½ гадоў мы робім з іх сьлесараў сярэдняй кваліфікацыі і трактарыстаў. За адно яны ўсвойваюць агульна-адукацыйныя дысцыпліны. Пасьля гэтага перадаем іх на завод.

У іх ёсьць свае політгурткі,—там у абавязковым нарадку займаюцца ўсе падлеткі. Ёсьць гурток драматычны, музыкальны, рысавальны. Над імі ўзяў шэфства Замаскварэцкі райком УсеЛКСМ. Усе хлопцы пагалоўна ахоплены грамадзкай работай. Маюць свае таварыскія суды, рэдакцыйную колегію для насьценгазэты „Магнэто“.

— Організацыйная школа пабудавана на вайсковым прынцыпе. Кожная рота разьбіваецца на тры разьдзелы з вайсковай дысцыплінай і з абавязковымі вайсковымі заняткамі. У праграму ўваходзяць фізкультурныя заняткі, зімовы спорт.

У двары напраўчага дому адбудоўваецца каток, паглядзелі-б вы, як захапляюцца яны канькабежным спортам—пападаюцца такія аматары, што трымайся. Свае спаборніцтвы, свае арбітры, свае прэм'еры па спорту. Летам—волейбол, гарадкі. Калі са сваім духавым оркестрам выходзяць ваенным строем у горад на пагулянку, можна заглядзецца. Для іх нашы майстэрні пашылі шынэлі, форму, далі ім абутак, бялізну—яны ні ў чым ня маюць недахвату.

— Пойдзем цяпер паглядзім як праходзіць іх „быт“ у камэрах.

Я ахвотна пашоў. Вялікая частка занятых батальёнам памяшканьняў прыбрана вялікімі палотнішчамі, па сьценах—портрэты правадыроў, лёзунгі. Яны гавораць: „Носьбітам разлажэньня сярод выхавальнікаў дадзім дружны адпор—прыцягнем да парадку хуліганаў“.

„Дадзім новыя кадры кваліфікаваных рабочых Савецкаму Саюзу з былых злачынцаў“. „Праз працу і культуру—да новай працы“. „Няма месца ў ФЗВ гультаём і сымулянтам“.

Акуратны прыбраны пасьцелі; пачкі кніг на вокнах, на сталах і на табурэтках, што стаяць каля ложкаў. Шумная, вясёлая бегатня.

Вучэбна-выхаваўчая частка пабудавала сваю работу з падлеткамі так, каб ня было ў іх на працягу дня пустых пралётаў. З раніцы да 4-х гадзін ідуць заняткі ў школах—тэорыя і агульна-адукацыйныя прадметы; з 4-х да 5-ці—абед; з 5-ці да 6-ці—вайсковыя заняткі; з 6-ці да 10-ці—практыка ў майстэрнях пад кіраўніцтвам інструктара, спэцыяльна для гэтай справы запрошанага з волі; ў 10 гадзін—зварот у камэры,—чытаньне кніг, гульня ў шахматы і шашкі.

У камэрах ёсьць да двох дзесяткаў музыкальных інструмантаў—балалайкі, гітары. Часьцяком тут бываюць самадзейныя концэрты. На вайсковых занятках я аднойчы чуў іх сьпевы. Сьпявалі бадзёра—на тварах быў сум. Мне тлумачылі, што гэта ад таго, што на людзях „радавыя“ робяцца нейкімі ненатуральнымі. Затое ў камэрах яны весяляцца, як дзеці дае—



Зварот з заняткаў

сябе знаць узрост. Вось і цяпер чую як з суседняй палаты запявае тэнор: „Быстры як хвалі“, нехта перабівае: „Накінуў плашч“, падлеткі падхопліваюць і хорам, некалькі чалавек, завяршаючы гэты сьпеў, пачынаюць баявую популярную песьню: „Нас пабіць, пабіць хацелі“.

Сярод падлеткаў ёсьць і літаратары. Толькі ўчора я чытаў нататкі аднаго з няпоўналет іх злачынцаў. Я аспытаў аб ім падрабязьней. Выявілася, што ён з 12-ці год, уладжваючыся на дахах вагонаў, лесьвіцах і іншымі прымі ыўнымі спосабамі—умудрыўся аб'ехаць усю краіну. Накапіліся ўражаньні, яго прыцягвае папера.

Вось адзін з яго ўрыўкаў:

„Пашлі лясы без канца,—глухія нетры, балоты ў нізінах, яркая роўная трава, на якой прыемна паваляцца ў цяньку густых дрэў, мелкія ручайкі спрытна нясуць узбламучную ваду з гары, дарога ў горы вядзе праз палатно; вось балоты, яны зарасьлі высокім чаротам і пасьля іх—горад. Майскі дзень—Першамайскае сьвята,—усюды весяляцца; праходзяць парады, мітынгі, многатысячныя тоўпы зьмешаных нацыянальнасьцяй. Пазаду асталіся чароўныя вобразы прамяністых Гаграў; горы ўрэзаліся ў воблакі, палацы, як арліныя гнёзды ўрэзаліся ў скалы,—некалі ў іх жылі прынцы крыві,—гуляшчыя латругі з мяшкамі золата. Яркая падтрапічная расьліннасьць. Прыгожыя віды на блакітнае спакойнае мора.

Сухум—горад палацаў. Вось яна агромністая бухта, а вакол усё дачы, асабнякі, выступы, што падымаюцца над морам, купалы з готычнымі шпілямі, адбіваючымі залацістыя праменьні сонца. Здалёк здаецца, што гэта казачны горад. У ранішнім сонцы мільгаюць ж нчыны, такія прыгожыя, прывабныя.

Далей, як на экране—Поці, Батум, Кутаіс.

Я папраўляюся; у мяне твар у шалусе, быццам пасьля сьпякоты; адчуваю радасьць дзіцяці, і быццам ня было за сьпіною 5-гі гадоў бадзяньня.

Качу на аўтомобілі за горад. Трачу грошы, якія папалі да мяне ў выніку мінулага налёту. Беспарадачна нясуцца дрэвы насустрач; у далі зіхацяць срэбрам ланцугі гор. А ад Кутаісу да Туапсе—чорная паласа,—Чорнае мора, як цьмяны калідор“.

Літаратар—юнак, яму 18-ты год. Зараз ён толькі і марыць аб тым, каб напісаць кнігу. Вытрымана працуе над зьбіраньнем матэрыялаў па гісторыі батальёну няпоўналетніх злачынцаў. Увайшоў у сваяасаблівую коопэрацыю з таварышам па пасьцелі—Розэнсонам.

Мне апавядалі пра гэтага другога літаратара, што ён асабліва здольны юнак, які сваёй інтэлектуальнай сілай зьдзіўляе акаляючых.

На волі гэта быў павадыр піянэрскага атраду, растраціў грамадзкую касу, падгаварыў некалькі таварышоў зрабіць вандраваньне ў Аўстралію, па дарозе зрабіў налёт і папаў у Маскоўскі Працоўны дом няпоўналетніх, адкуль яго ўжо перакінулі ў батальён у Таганку.

Батальён ганарыцца сваім запявалам. І на самай справе, у 17-гадовага хлопца, якога ўсе чамусьці называюць Алёшай Паповічам,—цудоўны моцны, голас, які вечарамі вельмі часта разносіцца па вялізнаму двару.

Алёшай Паповічам яго празвалі, мусіць, за прыгожасьць і высокі рост. Ён заўсёды галодны.

Калі прыходзіць час абеду і ў камэры зьяўляецца бразганьне пасуды і лыжак,—ён чакае ля стала хвіліну, калі адчыняцца дзьверы і прынясуць медзяны бачок, напоўнены дымчатай жоўтаватай кашай. На яго губах ужо загадзя зьяўляецца засмакаваная ўхмылка. Ён бярэ бачок дрыжачымі рукамі і пакуль астатнія прыстасуюцца,—стараецца напхаць сабе ў рот як мага больш кашы з таго месца, дзе яна больш заводлена маслам.

Таварышы спачатку раздражняліся яго манэрай, зьняважліва пазіралі на яго, калі мармычучы, ён прагна накідваўся на яду,—потым звыкліся. Пасьля абеду доўга захоўваецца на яго твары выраз шчасьлівае стомы.

(Працяг будзе).

Кастрычніцкае СЛОВА

Верш
ТОДАРА АЛЕСІНА

У нас
не заплаканыя вочы,
што шлях быў
крывавый касьцісты,
бо мерлі
за волю рабочых—
сыноў
зямлі балацістай.


Сягоньня
ўрачыста
прыпомнім мы
шлях свой
пройдзены й
перажыты
і тых,
хто
ўміраў у полымі,
ў хвалях
варожага іпрыту.

Мне-б
здольнасьці іх
і гартованасьць
зрадніць
з індустрыйнай песьняю,
каб быць нам
заўсёды гатовымі
у бой
за сусьветную Прэсьню.


У нас
не заплаканыя вочы,
што шлях нам
рыхтуюць касьцісты.
Мы пойдзем
за ўладу рабочых
утройчы
агністымі.

Хай толькі
насунецца хмараю
здань
крыважэрнай Эўропы—
мы нарадзіліся
у пажарах
на перакопах.

30-X—31 г.
Менск.



Трактары гатовы да адпраўкі ў сацыялістычны сэктар Саюзу ССР.
Сталінград, трактарны гігант.



Талачын. Колгас імя XII зьезду КП(б)Б. Малацьба аўса.

КРАІНА ПАВІННА ВЕДАЦЬ СВАІХ ГЕРОЯЎ

АНДРЭЙ ШЫШКОЎ

НАРЫС ПЯТРУСЯ БРОЎКІ

Цікава, што пачалося з дажджу. Позьняя вясна страсанула хмарамі ў маі і буйныя кроплі вады цяклі раўчакамі па грудзях зямлі, па дахах, па пасялковай дарозе, па фабрычным двары.

Андрэй Шышкоў, захутаўшыся ў брэзантовы плашч, сьпяшаўся ў свой мэханічны цэх. Прызначанаму нядаўна з сьлесароў у загадчыкі яму хацелася паказаць як трэба наладзіць работу мэханічнай майстэрні, каб ня было скаргаў на рамонт і спасылак на тое, што мэханічны зрывае плян. І ў галаве ў яго як мітульга кропель у паветры мітусіліся думкі пра фабрыку. 110 тон паперы—гэта толькі сутачнае заданьне. А колькі мы даем: 25—30.

Чаму?

Спасылак было многа. А больш на тое, што торп падаецца няспраўна.

— Яно і праўда,—разважаў Андрэй,—трэба, скажам, у суткі 350 вагонаў выслаць з пагрузачнай, а высылаецца толькі 180—190. Вось і пустуюць часта бункяры на сілавой. Спыняецца рух машын. Застывае белая стужка паперы на барабанах. Маўчыць фабрыка.

Андрэй прайшоў асьлізглыя дзьверы канторкі і вышаў на фабрычны двор. Дождж бязьлітасна цадзіў як з вядра. На двары ляжала шмат жалезнага ламачча, скінутага ў няхлюмяжныя кучы, і гінула задарма. Раптам зрок Андрэя ўпаў на невялічкі паравоз, што стаяў у канцы двара. Маланкай праснеслася думка, прарэзала Андрэеву памяць. Ён падышоў да паравозу, які стаяў сярод гор ламачча абадраным, разьбітым, нярухомым, як мярцьвяк.

Андрэй падышоў, памацаў пранты, пашчупаў колы, якія на палову пазарасталі травой. Твар яго пакрыўся маршчакамі, потым ажыў. Ён высака ўстрахнуў галавою і быццам з кім гаворачы сказаў гледзячы на паравоз:

— Трэба цябе ажывіць!

Фабрыка „Герой Працы" перайшла на мясцовы тарпяны апал. Была пабудавана падвясная дарога на працягу 8 кілёмэтраў ад пагрузачнай да фабрыкі. Па тросах яе павінна было прабягаць у суткі 350 вагонак, нагружаных торпам, каб бесьперабойна давалася сіла машынам, каб тыя сваімі накатамі накручвалі ў суткі ня менш 110 тон паперы. Але бяда ў цягавай сіле. Ад балотнага масыву да пагрузачнай каля 2-х кілёмэтраў. Гэтую адлегласьць торп трэба падвозіць паравозам. Паравоз, які працуе цяпер на пагрузачнай, няспраўны, дыхавічлівы, ня можа доўга трымаць пары. Ідзе, ідзе, запхнецца, пакашляе густымі клубамі пары і стане. Стаіць тады пагрузачная. І галодныя пасткі бункяроў смагна чакаюць ежы.

На думку Андрэю ўсплылі словы сакратара парткому, што матавозы, якія абяцалі даць з Масквы, забралі на Магнэсабуд і што застаўся на пагрузачнай толькі той хворы паравоз, які ня можа падвозіць колькі трэба торпу з балота, каб накарміць бункяры сілавой.

У гэты час па тросе падвеснай дарогі прабегла вагонка і спынілася, зарыпеў, замуліўся каля слупоў і сьціх трос... А з сілявой станцыі глыбокія пасткі топак быццам прасілі бясконца ежы, здаровым арганізмам гудзелі: дай!.. дай!..

І вырас перад Андрэем малюнак пагрузачнай станцыі:

— Пустыр. Гарачае сонца. Як сонца гарачы і жоўты пясок. Два баракі, як дзьве згубленыя каробкі ад запалак на полі. Стаяць рабочыя каля пагрузачнай станцыі з перакошанымі тварамі і пустымі рукамі, стаяць і ня ведаюць, што рабіць.

А на балоце за дзьве вярсты ад пагрузачнай станцыі стаіць брыгада Барабанавай. Стаіць і сама Барабанава, вяртлявая дзяўчына-камсамолка, поўная запальнасьці і энтузіязму. Стаіць, бо ўжо поўна нагружаны вагонкі, а адвезьці некаму, бо змоўк быццам ахамянеў паравоз і ня цягне вагонак, якія даўно ўжо насыпаны, а цяпер некуды брыгадзе Барабанавай сыпаць торп. Няма парожніх вагонак.

І Барабанава і яе брыгада таксама стаяць злоснымі, з перакошанымі тварамі. Чуе Барабанава, што спыніліся машыны на фабрыцы, бо не хапае паліва, бо як гад змоўк паравоз, быццам нарачыта ня хоча адвозіць торпу. А брыгадніцы хваляцца:

— Барабанава!. Барабанава!.. мы-ж перавыканалі норму, чаму-ж ён не вязе?

І злуюцца брыгадніцы на балоце, што хворы паравоз зрывае іх плян...

І ў роспачы брыгадзікі з пагрузачнай, што паравоз зрывае іх плян...

І ў адчаі брыгадзікі каля папяровых машын, што паравоз таксама зрывае іх плян...

А паперы замест 110 тон—усяго толькі 30 тон. Гэта-ж сорам!

І ўсё гэта так перакруціла і перапаліла Андрэя, што ён ня чуў нават дажджу, закапорхаўшыся каля паравозу на фабрычным двары.

Позна за поўнач кінуў ён мацаць перанжаўленыя, мокрыя, асьлізглыя часткі паравозу. Ён адчуў, што гэты паравоз, які стаіць цяпер мёртвым, можа выратаваць на многа прамфінплян фабрыкі, і ў галаве паўставалі тысячы меркаваньняў, як ажывіць яго. Ён уяўляў ужо нескарыстаныя шрубы ў складзе мэханічнай, заржаўленыя, але здаровыя шчыты, што стаяць каля сьценкі ў такарнай, нескарыстаныя рашоткі ў ліцейнай... І ўжо ў галаве Андрэй адразу пакладаў гэтыя часткі да купы і здалося яму быццам выбег ягоны новенькі, моцны, наноў афарбаваны паравоз і памчаўся па рэ ках на балота па торп, на пагрузачную...

У мэханічную майстэрню ён прышоў, калі другая зьмена ўжо адыходзіла да хаты. На лесьніцы ён затрымаў майстраў Саньнікава і Барбарыча. Затрымаў і напалохаў нячуваным ускрыкам:

— Хлопцы, жыць будзем!..

— Што ты вярзеш... Чаго ты?—спыніўшыся запытаў Барбарыч, а спакойны Саньнікаў прыщчурана ўглядзеўшыся на Шышкова сказаў:

— Чаго ты вечна такі шалёны?

Андрэй паклікаў іх у бок і расказаў як ён мяркуе адрамантаваць стары паравоз. Доўга сядзелі яны разам, думалі, дзе і што ўзяць, але парашылі паравоз амаладзіць.

Так нарадзілася брыгада. Майстра Саньнікаў, Барбарыч і сам Андрэй Шышкоў.

Назаўтра прышлі ліцейнік Назарыч, токар Жывапісцаў і яшчэ некалькі рабочых.

Пачалі працаваць па выхадных днёх. Сядзелі ў рабоце так, што ня бачылі ні зьмен, якія праходзілі каля майстэрні, ні часу на полудзень і вячэру.

Стары ліцейнік Назарыч, які раней часамі любіў крыху выпіць і прапусьціць які дзень на працы, цяпер сядзеў неадыходна каля ліцейнае печы літаральна па 24 гадзіны.

Рабочыя проста дзівіваліся:

— Што стала, што зрабілася са старым Назарычам? Не спазнаць яго дый годзе!

Вось як перарабляла ўдарная праца людзей.

А адміністрацыя і галоўны мэханік Забубёны жартавалі:

— Што вы надумаліся, час толькі губляеце. З гэтага нічога ня выйдзе.

І калі зьвярнулася брыгада атрымаць кілё цьвікоў з аддзелу забесьпячэньня, дык цьвікоў не давалі на працягу тыдню. І толькі тады, калі ўбачылі, што паравоз пачаў ажываць, паверылі энтузіязму брыгады. Пачалі нават падганяць. Вызначылі тэрмін: скончыць паравоз 10-га жніўня.

А ўдарнікі парашылі інакш. Яны забыліся на былыя абразы і недаверлівасьць і высунулі сустрэчны:

— Паравоз скончым 1-га жніўня!

А ўжо 29 ліпеня паравоз быў гатовы. Бегала каля паравозу брыгада, што пусьціла яго. Яна хварэла за кожны шрубік у ім.

Паўстала пытаньне як загнаць яго на пагрузачную. 8 кілёмэтраў па дарозе, дзе пясок па забарсьні, а паравозу па калена. І тут надумаліся ўдарнікі. Ранейшы паравоз, што працуе цяпер на пагрузачнай, цягнулі сотні людзей і коні, падкладалі дошкі, па дарозе стаяў шум і гам, а яны зрабілі вельмі проста. Знашлі на двары 4 старых лёкамабільных колы, зрабілі з іх калёсы, падчапілі адным трактарам і завезьлі на месца.

Многа сходаў бывае на фабрыцы „Гэрой Працы". І часта з агульнымі лёзунгамі:

— даеш 110 тон!..

А як ліквідаваць прарыў канкрэтна гаварылася мала.

Тады загаварыла рабочая маса сваім здаровым, рабочым нутром, доўгаю практыкай, спрытным розумам і моцнымі рукамі. Пасыпаліся рабочыя прапановы:

— паставіць млынок „жардан" на 6-й самай большай машыне, каб драбней малолася мяса.

— Ачысьціць катлы на стара-сілавой станцыі, каб яна магла даваць энэргію на выпадак прастою новай.

— Ускласьці адказнасьць на пазьменных майстроў за брак.


— Арганізаваць падвозку торпу конямі.

Хвалі рабочых прапаноў узьнялі адміністрацыю, фабком і другія арганізацыі. Пачаліся вытворчыя нарады, вечары прапаноў і арганізм фабрыкі пакрысе пачаў здаравець. Процант выпрацоўкі паперы павялічыўся на 20—30.


Фабрыка „Гэрой працы" можа даць 110 тон паперы ў суткі. Пра гэта гаворыць абсталяваньне фабрыкі, энтузіязм рабочых, іх практычнасьць і вынаходзтва.

Трэба толькі гэтую энэргію арганізаваць так, як арганізаваў яе Андрэй Шышкоў.

СКУЛЬПТУРА З. АЗГУРА



У. І. Ленін.



Г. В. Плеханаў.

ТАМАШ КУРБАЦКІ

Камунар

У сьцюжы, згвеі
гадоў векапомных
Ён быў у атаках,
ен браў Перакоп;
З наганам і пікай
на ворагаў цёмных
Рашуча, нязломна
імчаў ўгалёп.
Гады адшумелі
разьюшаным шквалам,
Замоўкл гарматы
у пушчах, далінах.
Паклікала раньне
з пажараў навалы
На фронт
будаўніцтва краіны.
Ён скончыў атакі,
да роднай хаціны
Прышоў у падранай шынэлі.
І ў нэрвах мяцежыў
уздым сакаліны,
Упартасьцю вочы гарэлі.

* * *

Ён паклікаў і лепшых і шчырых
Да супольнае, творчае працы.
Разьвярнуліся
плечы шырай
Грамадою тварынь,
змагацца.

Непарушны,
упарты, няўтомны,
Як калісьці ўзброены пікай.
Зазьвінелі ў пушчы цёмнай
Песьні гарту, сякеры, крыкі.

За сасною лажыцца сасна,
Адкідаючы буйныя вецьці.
І шуміць маладзы сасьняк,
І з вачэй шчырасьць цёплая
сьвеціць.

Маладыя яны цесьляры
Скалыхнулі абшар багунны.
Сосны рэжуць, сякуць
ад зары,
Маладую будуюць комуну.

І адвозяць пахучыя дрэвы
На прасторы палёў багатых;
Дзе ў радасных крыках,
сьпевах
Вырастаюць сасновыя хаты.

Разьліліся дзяцячыя песьні,
Маладыя, бадзёрыя словы...
...Тут жыцьцё малажавае весьніць
Як вясна напрадвесьні—дубровы.

У працы цяжкай цьвітуць надзеі,
на руінах мінуўшчыны шэрай
У клапотах штодзенных дзеяў
Ён знаходзіць запал і веру.

Вочы гострыя зьмяты твар,
Бурай мужнай
жыцьцёвай дарогі;
У рысах цьмяных упартасьць,
гарт
Нашай гордай бунтоўнай эпохі.

* * *

Ён помніць жах
і бойкі Перакопу.
Хавае шмат глыбокіх
штурмаў памяць.
І сёньня ў новых бойках і
акопах
Куе комуну ўпартымі рукамі.
У рытмах бур
ня зломяць ветры гарту.
І колькі іх адважных, маладых...
Гартуе моц
уздым колен упартых
Нас ў творчы бой
паклікалі гады.

На штурмах дзён,
у баёх соцыялізму
Услаў іх верш,—
натхнёны агітатар!
Гратнітнай верай,
сілаю вялізнай
Ўздымаць вышэй
над краем сьцяг узьняты.

У грудзёх жыве
уздым бунтоўных год
І веліч дум акрэсьленай дарогі.
І калі бурна ў вогненны паход
Пратрубіць край
глыбокую трывогу,
Ён пойдзе зноў з упартасьцю вялікай,
За Перакопам
рушыць Перакоп,
Імчаць з гранатай.
з точанаю пікай,
У рашучы бой
на ворага ў галёп.

Менск, 1931 г.

СКУЛЬПТУРА З. АЗГУРА



АДЗІН З МНОГІХ

нарыс
ЮР. ЛЯВОННАГА



Ударнік т. Басаў.

Пятро Іванавіч скрыта ўсьміхаецца ў чарнявыя вусы, асьцярожна зьнімае трэсачку з левага рукава і спрабуе спрачацца з рэдактарам шматтыражкі:

— Ды што там... Лепшыя за мяне ёсьць!.. Колькі я там у майстрах хаджу?..

Гісторыя Пятра Іванавіча Басава—гісторыя ўпартае барацьбы рабочага-самавучкі за падвышэньне кваліфікацыі, за ўдасканаленьне, за набыцьцё тэхнічных ведаў.

Гэта гісторыя паступовага аўладаньня чалавекам сакрэтамі „конвэйера ўласных рук", гісторыя сына клясы, для якой праца сапраўды стала справай гонару, справай славы, справай доблесьці і гэройства.

У гады навальніц, калі нязьлічаныя ворагі імкнуліся задушыць маладую краіну жалезным ашыйнікам інтэрвэнцыі, блёкады, замахаў — Пятро Іванавіч насіў зялёны шлем, патрапаную шынэль і абкруткі.

1919—1920 гады...

33-я Кубанская стралковая дывізія...

Паўднёвая Украіна, Беларусь,—залатапагоньнікі Дзянікіна, легіянэры Шэптыцкага...

Тав. Басаў—у шэрагах Чырвонай арміі, на перадавых пазыцыях.

Аднаўленчы пэрыяд аднатаваўся ў жыцьці Пятра Іванавіча зьменай некалькіх рознастайных прафэсій. Большасьць яго працоўнага часу працякла ў Менску.

У „Вадаканале", у МЦРК, у вайсковым шпіталі, на грамадзкіх работах, на ўкладцы трамвайнай лініі...

У цэхах „Дрэваапрацоўшчыка" тав. Басаў— ка я двох год.

Ён пачаў з укладкі дубовых дошак,—дайшоў да дзяжурнага сушыльшчыка і дасягнуў годнасьці майстра.

— Асьвета ў мяне пачатковая,—уздыхае, гледзячы паверх бяседніка, Пятро Іванавіч—з тэорытычным багажом тугавата. Да ўсялякае прамудрасьці выключна на практыцы, сваёй галавою прыходзіцца даходзіць!..

— Адклікалі на торф памочнікам загадчыка цэху,—расказваюць таварышы Басава, — ну, хутка і выявілася, што Басаў наш з ягонаю работаю справіцца... І ня дрэнна справіцца!.. Тады і пачаў ён працаваць за „начальніка"!..

Апошнімі часамі тав. Басаў усур'ёз узяўся за самаадукацыю; выпісвае „Электротэхнікум на даму", дасканала праходзіць курс пачатковае партшколы, прапрацоўвае пытаньні тэхнічнай вучобы, зьвязаныя непасрэдна з варштатам.

— Толькі, вось шкода—часу бракуе... Амаль што няма калі і ў кніжку глянуць!—скардзіцца Пятро Іванавіч.

Тав. Басаў—актыўны рабкор цэхавай штодзёнкі і друкаванае шматтыражкі „Молатавец", сябра шмат якіх добраахвотных арганізацый і таварыстваў. Надоечы яго вылучылі ў брыгадзіры па праверцы рэалізацыі сталінскіх прапаноў на заводзе.

Гэта яго—лепшага ўдарніка—за ўзорную акуратнасьць, недапушчэньне спазьненьняў — ня раз прэміявала рабочая грамадзкасьць.

На запытаньне аб хворых баках у рабоце ягонага цэху, Пятро Іванавіч, падумаўшы, адказвае:

— Па рацыяналізацыі мы яшчэ мала чаго робім... Сушыльныя камэры патрабуюць рамонту... Калёрыфэрных труб не хапае, кондэнсатараў...

... У невялічкі пакой заўкому прарэзьлівай трэльлю урываецца гудок.


Твар Пятра Іванавіча адразу робіцца заклапочаным, і, пасвойму, суворым. Пятро Іванавіч нэрвова камечыць між пальцаў недакураную папяросу, і, ужо на хаду, дадае:

— ... загаварыўся я з вамі тут... Заходзьце, калі ласка, заўтра ў цэх! Пакуль...

На анкеце П. І. Басава—майстра сушыльнага цэху—пададзенай напярэдадні XIV гадавіны Кастрычніка ў бюро ячэйкі КП(б)Б—лаконічная і выразная рэзалюцыя:

— „Прыняць".

1-XI—31



П. ШВЭЙДЭЛЬ

БІОГРАФІЯ БАЙЦА

КРАІНА ПАВІННА ВЕДАЦЬ СВАІХ ГЕРОЯЎ



Ударнік т. Крупавец.

I

Людзі вярталіся з фронту

Коні, змораныя цяжкімі пераходамі, ішлі павольна, апусьціўшы галовы. Па гразкай, размытай васеньнім дажджом дарозе капыты коняй капалі ямкі, якія хутка зноў заплывалі. Цяжка ісьці коням. А дарога развярачваецца бяз концу і кожны яе зава от тоіць за сабой новы кавалак шляху, такі-ж цяжкі, як і ўжо пройдзеныя.

Пётра Крупавец ехаў у самай сярэдзіне чалавечага патоку. Конь, уткнуўшы морду ў хвост нечага жарабца, стараўся не адставаць. Халодны васеньні дождж ліў ужо каторы дзень і безрадасны ландшафт быў тым фонам, які адпавядаў настрою людзей.

Пётра разглядаў іх хмурныя твары і гэта не давала забыцца на тое, што здарылася.

Яшчэ некалькі дзён таму назад авангардам каціліся па дарозе сьпевы і пад кавалерыйскія мотывы нават змораныя коні ішлі весялей. Людзі, пакінуўшы ненавісны фронт, вярталіся да столькі год нябачанай хаты, выратаваўшыся ад сьмерці, везьлі хто матцы, хто жонцы ў падарунак сваё нязгубленае жыцьцё.

— Дахаты!

Людзям надакучыла класьці свае галовы няведама за што. Хопіць! І ня кідаючы зброі, якая складала частку чалавечага гарнітуру, пачалі разыходзіцца па хатах. Армія нібы сьнег пад першымі праменьнямі сонца, пацякла рэчкамі шэрых шынэляў па ўсёй краіне.

І раптам...

Полк абязброілі раніцою. Толькі пачаў займацца дзень, як у мястэчка, дзе полк адпачываў, увайшлі аўстрыйцы, а з імі як быццам і расейскі атрад, які называў сябе „гайдамакамі“.

Былі перамовы, былі пагрозы з абодвых бакоў, але нарэшце полк зброю здаў. Забралі і лепшых коняй.

І вось абязброеная чалавечая маса кранулася зноў. Зброя неяк яднала іх, — трымаліся разам, а цяпер кожны выбіраў сабе асабісты шлях. Полк губляў людзей нібы грошы з дыравай кішэні. Першымі адсталі тыя, у якіх забралі коняй. А потым і астатнія пачалі разьядноцца. То адзін, то другі стрымлівалі коняй, зьвярнуўшы з дарогі, кудысьці скакалі. Вечарам, калі змрок напоўз на дарогу, ад палка засталася маленькая горстка коньнікаў.

* * *

На адной з шматлікіх чыгуначных станцый былой расейскай імпэрыі застанавіўся атрад чырвонагвардзейцаў. Байцы, апранутыя хто ва што, па прынцыпу—хто чым багат, былі ўзброены ня меней страката. Пара—другая гранат на паясу з посьпехам замянялі вінтоўку, калі яе ня было. Наган бяз кобура, засунуты за гэты-ж пояс, абываталяй прывыкшых за яго скуранага адзеньня, непакоіў за тры вярсты, непакоіў нават больш за страшэнныя гранаты.

Праз некалькі гадзін атрад пакоціць на цягніку супроць ворага, а пакуль...

А пакуль сьпявалі, латалі вопратку, зброю прыстрэльвалі і... мітынгавалі:

— Няхай жыве рэволюцыя!

Адзін з чырвонагвардзейцаў, шпарка ідучы па пэрону, раптам затрымаўся каля салдата, які вось ужо некалькі хвілін з цікавасьцю паглядваў на гаманлівы атрад.

— Пётра!..

Далоні рук бразнулі і між землякамі пашла гарачая гутарка. А калі цягнік, цяжка ўздыхаючы, крануўся з месца, Пётра Крупавец разам з усім атрадам засьпяваў. Пад урачыстыя гукі атрад чатырнаццаць год таму назад ехаў біцца за лёс Кастрычніка. І Пётра Крупавец стаў баявой адзінкай шматмільённай арміі рэволюцыі. Гады былі, нібы бомбы, выбуховай матэрыяй, нашпігаваны барацьбой, і аб другім ня было думак.

Супроць Дзянікіна білася Чырвоная армія, замест дробных Чырвоных атрадаў. Крупавец камандаваў эскадронам і ня раз прыходзілася ачышчаць станіцы ад белай нечысьці. А барацьба была жорсткая, у ніжня-донскай вобласьці, дзе прыходзілася ваяваць з ашэльмаваным белай косьцю казацтвам,—на літасьць не разьлічвай.

І было:

Станіцу—Ніжні Кардзаіл—рвалі на часткі. То белыя выбіваюць чырвоных, то чырвоныя белых. Так восем разоў. І калі, нарэшце, чырвоныя ўжо сапраўды завалодалі ёю, дык знайшлі сваіх 400 таварышоў, у час боек, папаўшых да белых у палон. Белыя, каб ня сьцёрлася памяць аб іх, расстралялі чырвонаармейцаў. Чырвоныя знайшлі 400 мерцьвякоў.

І на новым фронце,—супроць белапалякаў,—Крупавец шчыра плаціў на гэтым непазабытым рахунку. Ня сьцёрлася памяць аб чатырохсот.

II

1925 год. Грамадзянская вайна, у якой былі заняты мільёны чалавек, даўно скончылася і вялізарная армія ваявала цяпер за рэволюцыю ўжо не на палёх краіны, а ў яе прамысловых карпусох І не аднойчы бывала, што байцы, якія былі з сьмерцю за панібрата, цяпер здавалі. Мірнае жыцьцё ня было ўжо такім мірным, як гэта здавалася на першы погляд.

Яшчэ да таго, як меліся прыбыць лінатыпы, друкарня ходарам хадзіла ад чутак. Напэўна ніхто нічога ня ведаў. Было толькі вядома, што такая машына ўнясе пераварот ва ўсю традыцыйную вытворчасьць цэху. Жартачкі: ні наборшчыка, ні касы... І што гэта толькі будзе.

Калі іх зьбіраў маскоўскі інструктар, чуткі сталі яшчэ больш блытанымі. Наборшчыкі круціліся каля іх, сачылі за рухамі інструктара, мацалі дэталі і нарэшце, частка іх вырашыла:

— З гэткай працай праз пяць год хадзі да бога на паклон — прасіся ў рай.

На лінотып пайшоў наборшчык Крупавец. Пайшоў яшчэ адзін. Растлумачыў інструктар так-сяк як абыходзіцца з машынай і паехаў сабе. А машына замежная, з гонарам, чуць ня так абыйдзешся з ёю, ня хоча працаваць. Ты з ёю і так і гэтак—не адліваюцца радкі.

Лёзунг—„аўладаць тэхнікай“ тады яшчэ ня быў вядомы. Але Крупавец зразумеў яго. Пачаў ён меркаваць што да чаго, сачыў як кожная дэталь працуе, якая яе функцыя. Некалькі разоў прышлося разьбіраць машыну.

Аднойчы мэталь з катла сплавіў ціскі дзе адліваюцца радкі і машына стала. Ужо вырашылі запаліць вогнішча пад машынай каб расплавіць сьвінец. Калі-б гэта зрабілі, лінатып на доўгі час выйшаў-бы з строю. Але Крупавец не дапусьціў гэтага, ён рызыкнуў разабраць ціскі. Адкруціў шматлікія вінцікі, шрубачкі ачысьціў часткі ад прыліпшага мэталю, сабраў іх зноў, раней пусьціўшы машыну на халасты ход і ўпэўніўшыся, што машына сабрана правільна, адліў некалькі радкоў тэксту. Усё было ў парадку.

Так вучыўся чалавек валодаць машынай. З кожным годам яна ўсё больш расчыняла перад ім сваё нутро. Трэба было рыхтаваць новых лінотыпістаў і Крупавец перадаваў ім свае-



тыя з такімі цяжкасьцямі веды. Ён ужо быў майстрам цэху і кожны лінотыпіст абавязкова быў яго вучкі. І цяпер ён кіруе гуртком маладых лінотыпістаў. У Дому Друку будзе працаваць значная частка і яго вучняў.

Дасканалае веданьне машыны дало магчымасьць т. Крупаўцу прапанаваць каштоўнае рацыяналізатарскае мерапрыемства. Календар, які раней набіраўся ручнымі наборшчыкамі, цяпер набіраецца на лінотыпе. Цяжкасьць была ў тым, што на машыне нельга набіраць памерам менш за тры квадраты. Крупавец дабіўся таго, што машына набірае на 2 квадраты. Трэба ўлічыць напружанае становішча з рабочай сілай, эканомію часу і г. д., каб зразумець каштоўнасьць гэтага мерапрыемства.

Так непакорлівы лінотып здаў перад былым чырвонагвардзейцам, а цяпер майстрам цэху лінотыпаў—Пётрам Крупаўцом.

* * *

Жыцьцё—яно ніколі не становіцца на адпачынак. Яно бесьперапыння зьмяняе нас, зьмяняе асяродзішча, і вось ужо ўчорашняе пачынае забывацца, сёньнешні дзень валодае чалавекам і патрэбна напружваньне памяці, каб далёкае мінулае зноў уваскросла перад вачыма.

Пётра Крупавец, які ў атрадзе Чырвонай гвардыі зварочваў чалавецтва з старой гразкой дарогі на новы, шырокі шлях свае клясы, працуе цяпер у нашай друкарні. Калісьці ён камандаваў эскадронам коньніцы, сёньня пад яго камандай толькі невялічкі атрад лінотыпаў. І мастацтва кіраваньня імі ня меней складана, чым вадзіць у бой эскадрон.

У бурлівы 17-ты год ён пачаў стварыць сваю гэроічную біографію. Шмат прыгожых старонак ёсьць у кнізе яго жыцьця... Але аднэй усё-ж не хапала.

Пётра Крупавец ня быў членам партыі.

Партыя, пад сьцягам якой ён біўся, за праграму якой мільёны ішлі на сьмерць,—гэта партыя ня мела яго ў сваіх шэрагах. Якія-б прычыны ён ня прыводзіў—гэта ня было адказам.

Хіба справа партыі не яго справа? Які бар'ер стаяў між імі і партыяй? Ніякі—аб гэтым кажа яго жыцьцё.

І вось у дні XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі Пётра Крупавец далучыў да сваёй біографіі яшчэ адну каштоўную старонку.

У памяць 400 сваіх, расстраляных за справу партыі таварышоў, партыйны колектыў атрымаў ад яго заяву.


Гэта лёгічны канец ня меней лёгічнага пачатку—уступленьня ў атрад Чырвонай гвардыі чатырнаццаць год таму назад.

Песьня ПРА ПАРАВОЗ

Ю. БІТУС

Ён у сажы, павольны пад час,
З белымі ліхтароў вачыма,
Ад Уладывастоку да Менску
прымчаў
З грузам цяжкім за плячыма.
Ён паравоз стары,
На тормазах Вэстынгаузу
Прарэзаў тайгу Сібіры,
балотны туман
пад Вязьмай.
Ён паравоз стары
Падбіўся ў дарозе, дый годзе.
Згубіў сваіх крокаў
рытм,
Да нас у дэпо заходзіць.
Сунецца..
Ціха, ціха.
Павольны, нясьмелы, грузны
Цяжка, жалобна дыхае
Доўгай дарогай змучаны.
А мы малаткамі,
бы па слану.
Мяркуем—работы на дзень.
Скідай кашулю і бялізну
Здароўе ўраз наладзім.
Станем брыгадамі
За варштат.
— А ну падстаўляй дамкраты.
Трэба здароўе
тваё паляпшаць
Сілай і воляй—упарта.
Дэпо—гэта буйны,
ударны цэх.
Заходзь наш бягун далёкі.
На опэрацыю панясем
Поршні твае і блёкі.
Будзем рэзаць цябе, кава[ць]
І песьні сьпяваць пад лё[зг]
Болю ня будзеш ты адчуваць,
Хоць і не дамо наркозу.
Пройдзе нясьціішным
экспрэсам дзень.
І ў напружаны працай вечар
Вясёлым і радасным загудзеш,
І груз накладзеш на плечы.
Зноў пабяжыш...
Імчы, імчы
На поўнач, на ўсход,
На поўдзень.
Стомішся: моцным гудком
пакліч—
Рабочы вадой напоіць.
Будзеш бярвеньні ізноў цягаць.
Рэйкі, каменны вугаль.
Угрунь па машруту
Урал—Тайга,
Па вобласьцях і акругах.
Угрунь па зямлі,
дзе грымяць агні
Вагранак і домнаў
нястрымных.
Ты прыдзеш,
наладжаны намі
цягнік.
Ты прыдзеш да соцыялізму.

Менск 1931 г.



Уборка ў калгасе.

РАБОЧЫ ПАСЁЛАК САЎГАСУ „ГІГАНТ“



КРАІНА ПАВІННА ВЕДАЦЬ СВАІХ ГЕРОЯЎ

ПЕРАМОГА на пуцях

нарыс
С. ГАЛАЕВА

Ад таварнай паказваецца паравоз. Ён хутка імчыць у напрамку да пасажырскага вакзалу. Па меры яго набліжэньня на ім усё выразьней вырысоўваецца „СУ 96-64“. Гэта — імя паравозу. Ён сьпяшаецца на зьмену свайму таварышу, каб імчаць дзесяткі зялёных пакойчыкаў далей праз станцыі і гарады.

Раптам насустрач яму з боку пасажырскай, па гэтым-жа самым пуці вылятае другі паравоз СУ 98-79.

Трывожна скалыхнулася паветра і ўдарыла ў вушы рэзкім кароткім сьвістам. Паравоз, які ішоў ад пасажырскай, хутка спыняе рух. Вось ён ідзе юзам. Яшчэ дзесяць мэтраў і паравоз стаіць. Другі-ж налятае... Колы яго круцяцца назад, але паравоз па інэрцыі рушыцца ўперад. Адлегласьць паміж імі хутка скарачаецца... засталося 10, 5, 2 мэтры... яшчэ сэкунда... д-р-ы-г-г-г! Стукнуліся жалезныя волаты... Д-р-ы-г-г!—аддалося ў пачарнелых ад сажы сьценах дэпо.

Ад моцнага ўдару абодвы паравозы адкаціліся назад. Паміж імі зрабіўся пралёт у некалькі мэтраў.

Стаяць паравозы, адзін супроць другога і цяжка сапуць, нібы думаюць над тым, што гэта, ці шкодніцтва ці безадказныя адносіны да справы?

Замест таго каб з грукатам імчацца, па рэйках, наперадзе дзесяткаў вагонаў, СУ 96-64, цяжка ўздыхаючы, ледзь дайшоў да дэпо. І невядома было колькі ён там прастаіць, калі яго вылячаць і ці вылячаць наогул. Паравозаў, з такімі хваробамі дэпо ніколі не рамантавала, іх адпраўлялі на завод.

Зусім скалечаны, заднім ходам, кульгаючы, пайшоў СУ 98-73 да сваёй хаты ў Аршанскае дэпо.

Абодвы паравозы былі сапсаваны аднолькава: парэднія рамы былі моцна пагнуты, пакарэжаны брусы і пажаваны буфэрныя талеркі.

* * *

— „Разьбіты два паравозы!“—перакідвалася ад аднаго рабочага да другога і хутка гэтая навіна абляцела ўсе цэхі і брыгады дэпо.

— „Разьбіты два паравозы“...—дайшло і да брыгады Лапкоўскага.

Ударнікі моўчкі пераглянуліся.

— „Два паравозы... шостае здарэньне за адзін тыдзень, — вымавіў брыгадзір Лапкоўскі, моцна сьціскаючы ручку малатка.

— „Толькі аддаць пад суд. Ну, як-жа гэта пусьціць насустрач два паравозы па адным пуці?“—дзівіўся 52-гадовы ўдарнік з сіваватымі вусамі і зубамі белымі, як сьнег. Ён на хвіліну спыніў працу, разгублена паківаў галавой, нешта гаворачы пра сябе, а потым яшчэ шпарчэй пачаў біць 20-ці фунтовым молатам па гарбіне жалезнай рэйкі, нібы на ёй было напісана: „Разьбіты два паравозы“. Ён высока паднімаў молат, нібы хацеў як мага хутчэй расплюшчыць, сьцерці гэтыя словы.

* * *

Ідучы на абед рабочыя на дзьвярох дэпо чыталі:

„Сёньня ў час абедзенага перапынку адбудзецца мітынг рабочых службы цягі“.

— „Ну, хлопцы, хутчэй шамаць, каб не спазьніцца на мітынг“. Па якім пытаньні павінен быў быць мітынг ніхто ня пытаў. Гэта ўсім добра было вядома.

На мітынгу выступалі шмат рабочых ударнікаў. Гаварылі коратка. Усе думкі былі накіраваны на тое, каб знайсьці прычыны здарэньня, каб зьнішчыць гэтую хваробу чыгункі — псаваньне паравозаў і вагонаў.

Ударнікі патрабавалі ад адміністрацыі правядзеньня іспытаў і інструктажу паравозных брыгад, устанаўленьня пэўных пуцей для падачы паравозаў пад цягнікі з-пад цягніка, з устанаўленьнем суровай адказнасьці за нарушэньне гэтага правіла.

Для машыністаў Макарава і Шэйна, дзяжурнага на станцыі Вараб'ёва—вінаватых у крушэньні — рабочыя патрабавалі суровай кары.

— „Паравоз трэба адправіць на завод, бо ў нашым дэпо і наогул ні ў адным дэпо такі рамонт ніколі не рабіўся. У нашых умовах паравоз адрамантаваць нельга“ — заявіў начальнік дэпо.

У гэты час два рабочых адышлі ў бок. Адзін нешта гаварыў. Другі стаяў і задумёна ківаў галавой, потым ударыў таварыша па плячы і цьвёрда сказаў: „Зробім“.

У іх тварах сьвіцілася надзея на свае сілы — на сілы сваіх брыгад. „Зробім“—гаварыла кожная рыса твару. Лапкоўскага, „зробім“ было бачна ў глыбокіх вачох Гаранскага. Яны моцна націснулі рукі і зноў падыйшлі бліжэй да трыбуны, якую замянаў паравозны кацёл пасярод дэпо. Вакол яго было жывое кола замасьленых куртак і замазаных твараў.

— „Ня трэба адпраўляць паравоз на завод. Мы яго адрамантуем самі“.

Усе павярнуліся ў той бок, дзе стаялі Лапкоўскі і Гаранскі.

— „Мы будзем працаваць у дзьве зьмены без выхадных дзён“—гаварыў Лапкоўскі.

— „К 15 верасьня паравоз будзе здаровым“—дадаў Гаранскі.

Ім не супярэчылі. Ведалі, што калі яны возьмуцца, дык зробяць. І сапраўды—перш чым узяцца за гэтую справу, Лапкоўскі аглядзеў паравоз, абмеркаваў, як пачаць работу, якія пры гэтым будуць цяжкасьці і як іх перамагчы. Не даваркючы сабе, ён парадзіўся з Гаранскім. Той згадзіўся з яго меркаваньнямі і дзьве брыгады кацельшчыкаў узяліся за рамонт.

Брыгады Лапкоўскага і Гаранскага — лепшыя па Менскім дэпо. У брыгадзе па 4 чалавекі. Разам з рабочымі, якія маюць да 30-ці гадоў вытворчага стажу, у брыгадах маюцца і маладыя комсамольцы апошняга выпуску фабзавуча.

Вялікі вытворчы вопыт старых, дапаўняе юнацкі запал і задорная бадзёрасьць моладзі. У брыгадах вельмі добра наладжана працоўная дысцыпліна.

— „А ўсё такі гэта рызыкоўна. Няма патрэбных інструмантаў, ды і тэрмін зусім кароткі—13 дзён“—гаварыў немалады, камякаваты рабочы.

— „Зробяць. Не такія хлопцы. Гэтая брыгада чорту рогі скруціць, а ня то што адрамантуе паравоз“,—супярэчыў другі.

Залівіста прагудзеў гудок і брыгады прыступілі да ўдарнага рамонту паравозу.

* *
*

Каля папсаванага паравозу таропка бегалі людзі. Паравоз уздрыгваў і гудзеў пэд ударамі молатаў.


— „Вось тут трэба падагрэць.

Вугаль кепскі—падкласьці буйнейшага.

—Ваня, стукні гэта месца, ды хутчэй, а то астыне,—адрывіста камандаваў Лапкоўскі. Брыгаднікі адзін перад адным стараліся паказаць сябе. Не пасьпее Лапкоўскі дагаварыць, як ужо молат паднімаецца ўгару і са звонам апускаецца на ўказанае месца.

Бакавіны рамы, нібы скібіцы вялізарнай жывёлы, выступаюць наперад. Паміж імі стаіць Лапкоўскі. Усім цяжарам цела ён наваліўся на тоўстую рэйку, прыціскаючы яе да разагрэтай да чырвонага колеру бакавіны рамы.

Гэта самы напружаны момант. Трэба даражыць кожнай хвілінай, бо рама хутка астывае, а каб нагрэць яе трэба патраціць некалькі гадзін.



Фабрыка-кухня саўгасу „Гігант“

— „Сто-о-й!—крыкнуў брыгадзір—Хопіць!“ Усе пабеглі да правай бакавіны рамы. Лапкоўскі прыжмурыў левае вока, нібы браў каго на мушку, наглядзеў уздоўж паравозу, павярнуўся і з задаволенай усьмешкай сказаў:

— „Гатова“.

— „Адна гатова“—паўтарыў Лапкоўскі.

— „Зараз пакурым, ды возьмемся за другую“.

Але закурваць ён ня стаў. Пачаў падграваць другую бакавіну.

*
* *

Рамонт скончылі за дзесяць дзён. Якасьць рамонту прызнана добрай. Урачыста быў выпраўлены СУ 96-64 з дэпо і накіраваны пад цягнік. Ён узышоў на круг, павярнуўся і пабег у напрамку да пасажырскага вакзалу.

Лапкоўскі і Гаранскі выйшлі на пуць і пільна сачылі за паравозам, які хутка ўразаўся ў далечынь. Ён рабіўся ўсё меншым і меншым і скора зусім зьнік з віду.

Гу-гу!—даляцела ад пасажырскага вакзалу.

Брыгадзіры пераглянуліся. Твары іх пакрыліся самазадавольнай, радаснай усьмешкай.

— „А аршанцы ўсё яшчэ б'юцца над рамонтам. У іх як быццам, нічога ня выходзіць“—зазначыў Лапкоўскі.

— „Трэба ехаць ім на дапамогу“—адказаў Гаранскі.

— „Добра. Едзем“..

Яны зноў моцна пацiснулі рукі і накіраваліся да начальніка дэпо.

ВАНДРОЎНЫ ТЭАТР

У ЛЯГЕРАХ ПАД МАСКВОЙ

Праца Вандроўскага тэатру пад кіраўніцтвам Галубка ў лягерах Маскоўскай акругі прайшла з надзвычайным посьпехам.

Тэатр працаваў у прыцягу 1½ месяцаў і пасьпеў даць 46 паказаў. Водзывы, якія выдадзены тэатру, сьведчаць аб тым, што тэатр цалкам выканаў даручанае яму заданьне.

Асаблівую ўдзячнасьць вынес тэатру цэнтральны Дом Чырвонай арміі ў Маскве за тое, што тэатр ня гледзячы на асабліва цяжкія ўмовы лягерных абставін, аддана працаваў ня толькі на сцэне, але і па-за сцэнай, павучаючы чырвонаармейцаў пралетарскім песьням і самадзейнаму мастацтву.

Усе паказы насілі характар вялікіх мітынгаў, дзе прысутнічалі тысячы байцоў, якія прасілі вітаць працоўных Савецкай Беларусі і ўрад, а таксама дзякавалі ўрад за прысылку тэатра ў брацкую рэспубліку.

Працаўнікі Вандроўнага тэатру, у абставінах лягераў, дзе ім прыходзілася рабіць разам з арміяй пераезды пераходы на многа вёрст пеша, даючы паказы і на полі, і ў лесе, удзень і ўвечар, выявілі вялікую вытрыманасьць.

С.С.С.Р.
НАЧАЛЬНИК
ЦЕНТРАЛЬНОГО ДОМА РККА
им. М. В. ФРУНЗЕ
5. Ав. 1931 г.
№ 5/1214/рме
МОСКВА
Пл. Коммуны, 2

Государственный Белорусский передвижной Театр под управлением народного артиста БССР ГАЛУБОК работал в течении июня и июля 1931 г. по заданию Центрального Дома РККА им. М.В.ФРУНЗЕ в лагерях Московского Военного Округа 27 дней и в Парке ЦДКА 9 дней.

Представляя собою крепкий спаянный коллектив национальной художественной единицы в простых формах показывал национальные Белорусские "примитивы".

Та масса хороших отзывов которую театр получил от красноармейских газет за свою работу безусловно подтверждает успешность выполнения театром задач, которые поставил перед ним ЦДКА.

За всю вполне успешно проделанную Театром в трудных условиях лагерной обстановки работу, за пропаганду массовой пролетарской песни, за товарищескую помощь красноармейской самодеятельности - Центральный Дом РККА приносит всему составу Государственного Белорусского Театра красноармейское спасибо.

Начальник Центрального Дома РККА имени М.В.ФРУНЗЕ /МУТНЫХ/

ТЭХНІКУ ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ

ЛЕСАТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ У ГОМЕЛІ

Янка Вястовіч

Вясной 1930 г. у газэтах была надрукавана пастанова ўраду аб заснаваньні ў горадзе Гомелі Беларускага дзяржаўнага лесатэхнічнага інстытуту. Пастанова аб ВНУ глыбока ўскалыхнула пролетарскую грамадзкасьць. Партыйныя, савецкія, профэсыянальныя організацыі заняліся падрыхтоўкай пляnаў работы інстытуту і падбoрам навуковых працаўнікоў. Рабочыя фабрык і заводаў рыхтавалі патрэбнае абсталяваньне для лябораторый. Гаркомгас вызначаў будынкі.

Прайшло лета. На галоўнай (Савецкай) вуліцы гораду з аднаго з лепшых дамоў прывабна пазірала шыльда з надпісам: „Беларускі Дзяржаўны Лесатэхнічны Інстытут". 8 лістапада ў часе сьвяткаваньня 13-й гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі інстытут спраўляў урачыстасьць свайго заснаваньня. Дзейнасьць інстытуту з першых-жа дзён набыла вялікі размах. Адбыўся першы прыём адразу на 4 нова-організаваныя аддзяленьні. Апрача ўноў прынятых, у інстытут уліліся студэнты былога лесфаку Беларускай Сельскагаспадарчай Акадэміі. Адначасова разгортвалася завочнае навучаньне.

Соцыялістычнае будаўніцтва паставіла побач з іншымі задачамі і задачу правільнай організацыі лясной гаспадаркі, найбольш рацыянальнага скарыстаньня драўніны, а таксама аблясеньня плошчаў няпрыгодных для земляробства.

Ува ўсёй гэтай рабоце на долю лесатэхнічнага інстытуту выпала вельмі сур'ёзная і адказная задача—падрыхтоўкі кадраў для ўсіх галін лясной прамысловасьці. Абвяшчэньне інстытуту ўстановай усесаюзнага значэньня патрабуе ўзьняцьця работы інстытуту на баявую вышыню, унясеньня ў яе строгай опэрацыйнасьці.

На шляху маладой навуковай установы сустракаюцца і вялікія цяжкасьці. Стаяла нават пытаньне аб перанясеньні дзейнасьці інстытуту ў РСФСР.

Цяпер у інстытуце маецца 5 аддзяленьняў: лесамэханічнае, лесакультурнае, эксплёатацыйнае, хэмічнае і экономічнае.

Вясной гэтага году выпушчана 65 студэнтаў. Зараз навучаецца 355 (з новым асеньнім наборам). На Ўсесаюзнай конфэрэнцыі прадстаўнікоў ВНУ устаноўлена номэнклятура спэцыялізацыі і тыпы спэцыялістаў, якія патрэбны лясной гаспадарцы.

Хэмічнае аддзяленьне аб'ядноўвае тыя віды хэмічнай апрацоўкі, якія базуюцца на экстрагаваньні розных матэрый з сыравіны (драўніны) — каніфоль, дубіцелі. Для праходжаньня практыкі лесахэмікаў у БССР маецца вытворчая база—экстрактна-каніфольны завод у Нова-Беліцы і жывічна-пераапрацовачныя заводы ў г. Барысаве і г. Бабруйску, завод дубіцеляў у Рэчыцы. Пэрспэктывы практычнай дзейнасьці надзвычайна вялікія.

У бліжэйшыя часы вызначаецца пабудова комбінату, які будзе складацца з экстракцыйнага заводу і заводу пераапрацоўкі шчэпы, якая атрымліваецца з экстракцыйнай пераапрацоўкі на цэлюлёзу. Лесакультурнае аддзяленьне мае вялікія пэрспэктывы, бо нам прастаіць вялікая работа па лесааднаўленьні, а таксама ў сувязі з разгортваньнем соцыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, па мэліорацыі лесу.

Вытворчай базай у разгортваньні працы лесамэханічнага аддзяленьня, па сваёй спэцыялізацыі (стандартныя будаўнічыя дэталі) зьяўляецца вялізарнейшы дрэваапрацоўчы комбінат у г. Бабруйску і рад дрэваапрацоўчых заводаў. На лесаэкономічным аддзяленьні мэтавая ўстаноўка—экономіка і організацыя лесасыравіннай вытворчасьці.


Вытворчая практыка да гэтага часу была дрэнна пастаўлена. Адсутнічала кіраўніцтва як з боку інстытуту, так і з боку тых прадпрыемстваў, дзе студэнты адбывалі практыку. У сучасны момант вызначаны спэцыяльны працаўнік, які будзе загадваць арганізацыяй практыкі.

На 1932 г. у плян будаўніцтва ўключана пабудова для інстытуту сталага будынку ў інстытуцкім гарадку. З вясны 1932 г., павінна быць распачата будаўніцтва інстытуцкага вучэбнага корпусу. Інтэрнат ужо будуецца.

Інстытутам узята цьвёрдая лінія на арабочаньне студэнцкага складу. У гэтым годзе былі ўтвораны спэцыяльныя падрыхтоўчыя курсы для рабочых з вытворчасьці. Пры інстытуце ўлетку гэтага году навучаліся дзесятнікі з леспрамгасаў. Інстытут прымае захады да заснаваньня лясного рабфаку з мэтаю панаўненьня студэнцкага складу.

Мы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу пролетарскай грамадзкасьці на важнасьць уздыму лясной гаспадаркі і падрыхтоўкі для яе кадраў. Па ўсіх леспрамгасах лесааднаўленьне яшчэ зьяўляецца закінутай галіною, з прымітыўнай вытворчай тэхнікай. У сэнсе машынізацыі работ па лесасеяньні амаль нічога ня зроблена. Між тым у БССР 300 тыс. га пяскоў і бросавых зямель, якія павінны быць аблесены, як мага хутчэй. Для выкананьня гэтай задачы патрэбна вялікая колькасьць стандартных прылад для леспрамгасаў.

На нашу думку, трэба дабудаваць да Гомсельмашу спэцыяльнае аддзяленьне лясных машын і прылад. Для ўзьняцьця работы інстытуту трэба поўнасьцю забясьпечыць катэдры належнымі машынамі і прыладамі. Асноўнаю мэтаваю ўстаноўкаю, на якую інстытут мог-бы орыентавацца ва ўсёй сваёй далейшай дзейнасьці, нам прадбачацца лесамашынныя станцыі. Гэту думку мы і выносім на грамадзкае абгаварэньне.



Будынак сталовай саўгасу „Гігант".

КУЛЬТУРНАЯ ХРОНІКА БССР

Пісьменьнікі на ўборцы бульбы

На здымку: М. Чарот капае бульбу



Менск. т. Семашка на зав. імя Варашылава



Да дзесяцігодзьдзя літаратуркай дзейнасьці А. Жарава


На здымку:
А. Жараў сярод менскіх камсамольцаў




УССР ХАРКАЎСКІ ТРАКТАРНЫ УСТУПІЎ У СТРОЙ



Беларускія калгасьнікі ў фармовачным цэху



Фармовачны цэх



Кавальскі цэх

БІБЛІОГРАФІЯ

ДРУКУЮЦЦА І ХУТКА ВЫЙДУЦЬ

I. Літаратура і мастацтва.

Барыс Мікуліч. „Наша сонца“ (аповесьць), стар. 160.

Зьместам аповесьці зьяўляецца буржуазная нацыяналістычная контррэволюцыя, яе бездапаможнасьць і шкоднасьць у час барацьбы рабочых і сялян, грамадзянская вайна, героічная рабоча-сялянская моладзь. Паказан комсамол і яго змаганьне за новыя мэтоды працы, у барацьбе за прамфінплян. Адлюстравана трагедыя сям'і буржуазнага профэсара контррэволюцыянэра, раскол буржуазнай сям'і ў ходзе рэволюцыі.

В. Казлоўскі. „Рахіль“ (поэма), стар. 40.

Зьместам кнігі зьяўляецца наступнае: у краўца Абрама дачка Рахіль, прыходзяць палякі, пачынаюцца пагромы, расстрэлы. Рахіль забіраюць і вядуць на расстрэл. Яе выратоўваюць партызаны і Рахіль робіцца партызанкай. Бацька Рахілі Абрам пра тое, што Рахіль партызанка, ня ведае і лічачы, што яе няма, што яна расстраляна (знайшоў труп другой дзяўчыны, расстрэлянай), вар'яцее. Нарэшце стары сустракае Рахіль—партызанку. Поэма Казлоўскага сьведчыць пра тыя процэсы, якія адбываюцца сярод маладых папутнікаў. Поэма будзе чытацца з цікавасьцю і зьяўляецца каштоўным укладам у рэволюцыйную (але не ў пролетарскую) беларускую літаратуру. Яна-ж агромністы крок у разьвіцьці В. Казлоўскага.

Цім. Зарэчны і С. Ліхадзіеўскі. „Поэма пра геройства“, стар. 20.

Гэта—нарыс пра той сапраўдны бальшавіцкі геройзм, які праявілі рабочыя Бабруйскага комбінату.

Цыркуляцыйная труба, па якой падаецца вада з ракі Бярозы, невядома дзе трэснула. Комбінат стаў. Трубы закапаны глыбока і каб адшукаць і паправіць іх, патрэбна два тыдні, а два тыдні гэта сотні тысяч рублёў страты. Малады рабочы прапанаваў палезьці ў трубу (дыям. у 35 сантымэтраў) і знайсьці трэшчыну. Ён спусьціўся ў трубу і трэшчыну знайшоў. Адтуль яго вывалаклі бяспрытомным. Два дні працавалі рабочыя над папраўкай цыркуляцыйнай трубы. Комуніст Пятро Совы сваім геройскім учынкам папярэдзіў прастой. Гэты факт—асобны эпізод, які аднак мае агульную значнасьць, пра які павінен ведаць рабочы і сялянскі чытач. У гэтай справе дапамагае кніжка: „Поэма пра геройства“.

Прудцікаў А. „На дарозе“, стар. 30. Зборнік вершаў Прудцікава „На дарозе“ вызначаецца актуальнай тэматыкай. Стрыжнёвай тэмай зборніку зьяўляецца індустрыялізацыя краіны і колектывізацыя. Сваімі вершамі аўтар мобілізуе чытача на выкананьне актуальных політычных задач, якія вызначаны партыяй.

Ул. Стэльмах. „Крушэньне рэнэгатаў“ (п'еса), стар. 20.

„Крушэньне рэнэгатаў“—твор досыць прымітыўны, але прымаючы пад увагу актуальнасьць тэмы і тое, што ў нас вельмі слаба адлюстроўваецца змаганьне рабочае клясы ў капіталістычных краінах—кніжка патрэбная. Можна раіць для пастаноўкі ў Трам'е і клюбах.

Лявонны Ю. „Маленькія апавяданьні“, стар. 50

Зборнік не пазбаўлены цікавасьці ў тым сэнсе, што ў ім даецца выяўленьне ў мастацкай форме асобных момантаў пройдзеных этапаў нашае рэволюцыі, а таксама даецца спроба ў мастацкіх вобразах адлюстраваць нашу выдатную сучаснасьць.

Тарас Гушча. „Адшчапенец“ (аповесьць).

У аповесьці паказваецца, як серадняк-аднаасобнік моцна прывязаны да сваёй уласнасьці, у знак протэсту супроць калгасу, які організуецца, пакідае сваю гаспадарку і ідзе ў сьвет. Пападае ў добра наладжаны колгас, дзе выдаўшы сябе за дэлегата дасканала знаёміцца з колгасным жыцьцём і пераконваецца ў перавазе колгасу над індывідуальнай гаспадаркай. У яго вёсцы за час яго адсутнасьці організуецца колгас. Сын і жонка ўступаюць у яго. Кулакі вядуць шалёную агітацыю супроць колгасу, скарыстоўваючы факт ухода Пракопа. Аднак калгас мацнее, сваім зваротам перакананы Пракоп дапамагае замацаваньню колгасу. Добра паказаны фігуры Пракопа і кулакоў, слабей фігуры колгасьнікаў.

З. Бандарына. „Непералічаныя мілі“.

Зборнік вершаў вельмі цікавы як па ідэйнай накіраванасьці (цэлы шэраг твораў) так і па мастацкіх прыёмах (разьмер, рыфма і г. д.).

II. Партмассэктар.

Садоўскі. „Раўняцца па героях“, стар. 60.

У сваіх нарысах аўтар у мастацкім аформленьні дае шэраг герояў чыгуначнікаў, дрэваапрацоўшчыкаў, электрыкаў і г. д. Прыклады ўзяты з рэчаіснасьці БССР. Работа т. Садоўскага зьяўляецца першай спробай популярызацыі герояў соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

„Праца таварыства гісторыкаў-марксыстаў, выпуск II. Дыскусія аб „Нашай Ніве“.

Кніга прадстаўляе сабой зварот спрэчак па пытаньню аб устанаўленьні марксыцка-ленінскага разуменьня эпохі „Нашай Нівы“. Каштоўнай і новай зьяўляецца тая ўстаноўка, якая выявіла з выстарчальнай яснасьцю буржуазна-кулацкія карэньні ідэолёгіі „Нашай Нівы“, яе сувязь у тэорыі і практыцы з ідэолёгіяй сьмалыпянішчыны, сувязь нацыяналізму з вялікадзяржаўнымі ўстаноўкамі групы „Мирообновленцев“, выявіла сувязь ідэолёгіі „Нашай Нівы з сучаснай ідэолёгіяй нацыянал-дэмократаў, дала ў асноўным прадуманае акрэсьленьне соцыяльна-клясавых карэньняў нашаніўцаў і іх сувязі з нацыянал-дэмакратызмам, выявіла аграрную і нацыянальную праграму „Нашай Нівы“.

Кніжка можа быць дапаможнікам у праходжаньні курсу „Гісторыя Беларусі“ у ВНУ.

III. Сельгассэктар.

Кудзінаў. Колгас „Новы Шлях“, стар. 20.

Брошура высьвятляе на адным з калгасаў БССР папярэдняе разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю. Напісана каротка, ясна. Патрэбна для колгасьнікаў, як матэрыял пры разьмеркаваньні даходаў.

Янка Палескі. „Шляхам перамог“, стар. 50.

Аўтар у популярнай мастацкай форме апісвае барацьбу аднаго з лепшых саўгасаў БССР—„Навасёлкі“, Койданаўскага раёну. Тэма надзвычайна патрэбная, такіх кніжак не друкавалася. Сам аўтар комсамолец-батрак, сын сельскагаспадарчага рабочага.

Н. А. Бахараў. „Дасягненьні І. В. Мічурына на службе соцыялізму“. Масква, Сельхозгиз, 1931 г.

Брошура ў популярной форме знаёміць чытача з дасягненьнямі Мічурына, яго мэтодыкай, ставіць пытаньне аб скарыстаньні па ўсяму Саюзу яго прац. Сэлекцыя, гібрыдызацыя, якая ўжываецца т. Мічурыным у галіне пладаводства і ягаднiцтва—для нашай соцыялістычнай гаспадаркі мае вялізарнае значэньне. Гэта брошура зьяўляецца аднэй з сэрыі популярных брошур пад назвай „Новыя сарты пладоў і ягад у саўгасы і колгасы“, якія будуць друкавацца Сельхозгизам. Дасягненьні т. Мічурына зусім невядомы ў БССР. Брошура будзе карысная для нашай рэспублікі і павінна зацікавіць нашу колгасную моладзь масавымі досьледамі па сэлекцыі і гібрыдызацыі па мэтоду т. Мічурына.

ПА ЧЫРВОНАЙ БЕЛАРУСІ



Яэп Майстэр сярод сваіх таварышоў.




Яэп Майстэр—малалетні, надзвычайна здольны студэнт Менскага Музтэхнікуму.

На здымку: Майстэр з другімі студэнтамі тэхнікуму.



Зварот Чырвонай арміі з манэўраў.




Пабудова Палітэхнікуму ў Менску.

ШАХМАТЫ № 8

МІЖНАРОДНЫ КОНКУРС „ЧЫРВОНАЙ БЕЛАРУСІ“

Задача № 15.


Дэвіз „Даеш 5 у 4“.



Мат у 2 хады

Задача № 16.

Дэвіз „Allo von Leningrad“.



Мат у 2 хады

АКАНЧАНЬНЕ № 1

У папярэдняй групе № 3 усесаюзнага шахматнага турніра, у партыі паміж галоўнымі конкурэнтамі на першае месца Мазэлем (Менск) і Таніным (Масква) атрымалася, пасьля напружанай барацьбы наступнае становішча (гл. дыягр. № 1):

Партыя гэта ігралася ў 4-м туры, у Таніна было перад турам +3 з 3, у Мазэля +2½. Для Таніна было даволі нічыі, у той час як Мазэлю неабходна выйграць. Атрымаўшаеся становішча нічэйнае. Нельга выйграць белым пры правільнай ігрэ чорных, і наадварот нельга выйграць чорным пры правільнай ігрэ белых.

Нічыя белых не здавальняла і яны зіігралі:

1. Ke5—d3!?	C6—c5
2. Kd3:b4!	......


Альбо выйграць, альбо праіграць!

2.	a5:b4+
3. Kp C3—d2	Ce6:b3?

Чорным неабходна была біць канём 3. ... Kd4:b3+ 4. Kp d2—c2 Kb3—d4+ 5. Kp c2—∽Ce6—d7 і чорныя лёгка выграюць. Пасьля гэтага зусім безабіднага ходу, яны праігрываюць.

4. a4—a5!	C5—c4
5. a5—a6!!	....

Чорныя: Танін



Белыя: Мазэль

Ход белых

Дыяграма № 1

Паспрабуйце яе дагнаць.—яна імчыцца са шпаркасьцю кур'ерскага!

5.	c4—c3+
6. Kp d2—c1	c3:b2+
7. Kp c1:b2	....

Чорныя прымушаны ахвяраваць слана, інакш белая пешка **ав** праходзіць у фэрзі.

7.	Kd4—b5
8. Kp b2:b3	Kp d6—c5
9. Cg2—f1	Kb5—a7
10. g3—g4!	

Адзіны выйгрышны ход!

10.	f7—f6
11. Cf1—d3!	......

Пагражае 12. h2—h4 і 13. Cd3:g6, пасьля чаго пешка h праходзіць у фэрзі.

11.	g6—g5
12. f4:g5	f6:g5
13. Cd3:h7	Ka7—b5
14. Ch7—e4	Kb5—a7
15. Ce4—b7	Ka7—b5
16. Cb7—c8	Kb5—a7
17. Cc8—a7!	....

Калі-б пасьля гэтага ходу белых, быў-бы зноў іх ход, яны выйгралі-б ходам 18. h2—h4! Таму іх задачай цяпер, выйграць тэмп.

17.	Kp c5—d6
18. Cd7—e8!	Kp d6—c5
19. Ce8—a4!	Ka7—c8
20. Ca4—d7!!	Kc8—a7

Атрымалася становішча, якое і патрэбна было белым!

21. h2—h4	g5:h4
22. g4—g5	Kp C5—d6
23. g5—g6	Kp d6—e7
24. Kp b3:b4	і Танін здаўся.

Фінальнае становішча заслугоўвае дыяграмы (№ 2).

Майстарскі праведзены Мазэлем канец.

VII УСЕСАЮЗНЫ ШАХМАТНА-ШАШАЧНЫ ЗЬЕЗД

Усесаюзны шахматны турнір

10 кастрычніка ўсесаюзным шахматным турнірам распачаўся VII усесаюзны шахматна-шашачны зьезд.

Усе рэспублікі СССР, усе вобласьці мелі сваіх прадстаўнікоў на гэтым спаборніцтве. Усіх 80, якія разбіты на 8 груп. Амаль ва ўсіх групах моладзь захапіла першыя месцы і выйшла ў фінал, які склаўся з 2-х пераможнікаў ад кожнай групы.

У фінал вышлі наступныя таварышы: ад 1-й групы: Юдовіч (Масква); Раўзер (Кіеў); ад 2-й: Кац (Масква), Замыхоўскі (Кіеў) і Гаглідзэ (Тыфліс); ад 3-й Мазэль (Менск) і Ільін-Жэнэўскі (Парыж) [1]; ад 4-й: Каспаран (Тыфліс) і Батвіньнік (Ленінград); ад 5-й Сарокін (Тыфліс) і Алаторцаў (Ленінград); ад 6-й: Готгільф (Ленінград) і Будо (Ленінград); ад 7-й: Раманоўскі (Ленінград) і Кірылаў (Харкаў) і ад 8-й: Лісіцын (Ленінград) і Созін (Ноўгарад).

Перад самым пачаткам спаборніцтваў у фінале, у часе дзелавой часткі зьезду м. Готгільф і м. Раманоўскі зрабілі антыграмадзкія ўчынкі, за што зьезд пастанавіў выключыць абодвых з савецкай шахматнай арганізацыі; першага назаўсёды, другога на год.

Такім чынам засталося 15 чалавек—6 майстроў і 9 прадстаўнікоў моладзі. Для падняцьця якаснага боку турніра на першынство СССР зьезд пастанавіў уключыць **майстра Руміна** (чэмпіёна Масквы), які стаў на адным месцы з Будо, але не папаў па табліцы Бэргера, **гросмайстра Вэрлінскага** — былога чэмпіёна СССР і **м. Багатырчука** — чэмпіёна СССР у 1927-28 годзе.


Фінал распачаўся 25 кастрычніка ў складзе 18 чалавек. Па умовах, якія былі агалошаны перад пачаткам фіналу, усе таварышы, выйграўшыя 50% партый, атрымоўваюць годнасьць майстра СССР.

Фінал скончыўся 12 лістапада бліскучай перамогай майстра Батвіньніка (Ленінград), які выйграў 13½ з 17, на 2-м месцы м. Румін (Масква)+11½, 3, 4, 5 і 6-е падзялілі мм. Вэрлінскі, Багатырчук, Алаторцаў і Юдовіч па +10, на 7-м—м. Кан +9½, на 8-м і 9-м мм. Мазэль і Раўзэр, 10 і 11 занялі мм. Лісіцын і Кірылаў +8½.

Усесаюзны шахматны турнір даў 5 новых майстроў — Алаторцаў, Юдовіч, Мазэль, Лісіцын і Кірылаў. Гэта сьведчыць аб тым, што шахматная гульня ў СССР разьвіваецца шпаркімі тэмпамі, што расьце новая рась савецкіх майстроў.

[1] Сакратар савецкага паўпрэдства ў Францыі.


Чорныя: Танін



Белыя: Мазэль

Дыяграма № 2


АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ ПРАЦЫ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ВСНГ БССР 1928 г. 1931 г.



ТОРФ аб'яднаньне

Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у тыс. руб.			Сярэдне-гадав. сьпісачн. кольк. рабочых		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	1932-33 г. па пяцігодцы Абсал.	1928-29 г.	1930 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
1.574	5.309	7.648	742	1.335	2.216

Капіталаўкладаньні ў рэспубліканскую прамысловасьць (у тыс. руб.)					
1928-29 г.	Асобн. кв. 30 г. абс.	1931 г. Абсал.	За 3¼ г. (28-29—30 г.) чак. выкан.	За 5 год па пяцігодцы	Выкананьне 5-цігодкі ў 3¼ гады.
509	642	7.200	10.865	13.096	83,0



МЭТАЛ аб'яднаньне

Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у тыс. руб.			Сярэдне-гадав. сьпісачн. кольк. рабочых		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	1932-33 г. па пяцігод. Абсал.	1928-29 г.	1930 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
15.239	43.152	39.371	3.848	6.410	8.256


Капіталаўкладаньні ў рэспубліканскую прамысловасьць (у тыс. руб.)					
1928-29 г.	Асобн. кв. 30 г. абс.	1931 г. Абсал.	За 3¼ г. (28-29—30 г.) чак. выкан.	За 5 год па пяцігодцы	Выкананьне 5-цігодкі ў 3¼ гады
3.234	912	5.250	13.666	23.102	59,2

ХЭМ аб'яднаньне

Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у тыс. руб.			Сярэдне-адав. сьпісачн. кольк. рабочых		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	1932-33 г. па пяцігод. Абсал.	1928-29 г.	1930 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
1.506	4 130	14.624	136	905	834

Капіталаўкладаньні ў рэспубліканскую прамысловасьць (у тыс руб.)					
1928-29 г.	Асобн. кв. 30 г.	1931 г. Абсал.	За 3¼ г. (28-29—30 г.) чак. выкан.	За 5 год па пяцігодцы	Выкананьне 5-цігодкі ў 3¼ гады
452	243	3 205	5.731	12.003	47,7


АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ ПРАЦЫ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ВСНГ БССР 1928 г. 1931 г.



ЗАПАЛКА аб'яднаньне з дрэваапрацоўчай

Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у тыс. руб.			Сярэдне-гадав. сьпісачн. кольк. рабочых		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	1932-33 г. па пяцігодцы Абсал.	1928-29 г.	1930 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
12.787	24.294	23 620	4.484	6.656	6 303

Капіталаўкладаньні ў рэспублік. прамысловасьць (у тыс. руб.)					
1928-29 г.	Асобн. кв. 30 г. абс.	1931 г. Абсал.	За 3¼ г. (28-29—30 г.) чак. выкан.	За 5 год па пяцігодцы	Выкананьне 5-цігодкі ў 3¼ гады
2.333	154	790	5.391	5.790	93,1



ПАЛІГРАФ аб'яднаньне

Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у тыс. руб.			Сярэдне-гадав. сьпісачн. кольк. рабочых		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	1932-33 г. па пяцігодцы Абсал.	1928-29 г.	1930 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
2.592	13.420	4.981	347	1.316	1.420

Капіталаўкладаньні ў рэспублік. прамысловасьць (у тыс. руб.)					
1928-29 г.	Асобн. кв. 30 г. абс.	1931 г. Абсал.	За 3¼ г. (28-29—30 г.) чак. выкан.	За 5 год па пяцігодцы	Выкананьне 5-цігодкі ў 3¼ гады
53	44	883	1.469	335	438,5


СКУР аб'яднаньне



Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у тыс. руб.			Сярэдне-гадав. сьпісачн. кольк. рабочых		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	1932-33 г. па пяцігод. Абсал.	1928-29 г.	1930 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
16.263	52.805	49.611	1.607	4.207	5.230

Капіталаўкладаньні ў рэспубл. прамысловасьць (у тыс. руб.)					
1928-29 г.	Асобн. кв. 30 г. абс.	1931 г. Абсал.	За 3¼ г. (28-29—30 г.) чак. выкан.	За 5 год па пяцігодцы	Выкананьне 5-цігодкі ў 3¼ гады
2.405	867	1.625	8.249	10.193	80,9

АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ ПРАЦЫ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ВСНГ БССР 1928 г. 1930 г.





ШКЛО АБ'ЯДНАНЬНЕ

Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у т. руб.			Сярэдне-гадав. сьпісачн. кольк. рабочых		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	1932-33 г. па пяцігод.	1928-29 г.	1930 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
8.139	8,741	14.334	3.854	4.174	3 425

Капітальўкладаньні ў рэспубліканскую прамысловасьць (у тыс. руб.)					
1928-29 г.	Асобн. кв. 30 г. абсал.	1931 г. Абсал.	За $3^1/_4$ г. (28-29—30 г.) чак. выканан.	За 5 год па пяцігодкі	Выкананьне 5-цігодкі у $3^1/_4$ гады
938	387	5.050	8.371	13.675	61,2

ШВЕЙ АБ'ЯДНАНЬНЕ

Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у т. руб.			Сярэдне-гадав. сьпісачн. кольк. рабочых		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	1932-33 г. па пяцігод. Абсал.	1928-29 г.	1930 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
36 076	197.351	149.502	3.403	6.063	10.760

Капіталаўкладаньні ў рэспубліканскую прамысловасьць (у тыс. руб.)					
1928-29 г.	Асобн. кварт. 30 г абсал.	1931 г. Абсал.	За $3^1/_4$ г. (28-29—30 г.) чак. выканан.	За 5 год па пяцігодцы	Выкананьне 5-цігодкі ў $3^1/_4$ гады
1.546	744	1.120	5.760	6.486	88,8

ТЭКСТЫЛЬ АБ'ЯДНАНЬНЕ

Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у т. руб.			Сярэдне-гадав. сьпісачн. кольк. рабочых		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	1932-33 г. па пяцігод. Абсал.	1928-29 г.	1930 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
13.282	83 319	14.800	3.940	4.922	6 522

Капіталаўкладаньні ў рэспубліканскую прамысловасьць (у тыс. руб.)					
1928-29 г.	Асобн. кв. 30 г. абсал.	1931 г. Абсал.	За $3^1/_4$ г. (28-29—30 г.) чак. выкан.	За 5 год па пяцігодцы	Выкананьне 5-цігодкі ў $3^1/_4$ гады
2831	670	3.205	11.099	45.953	24,1

БУДМАТАР'ЯЛЫ

Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у тыс. руб.			Сярэдне-гадав. сьпісачн. колькасьць рабочых		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	1932-33 г. па пяцігод. Абсал.	1928-29 г.	1920 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
1.900	3.453	8 952	787	1.243	2.063

Капіталаўкладаньні ў рэспубліканскую прамысловасьць (у тыс. руб.)					
1928-29 г.	Асобн. кв. 30 г. абсал.	1931 г. Абсал.	За $3^1/_4$ г. (28-29—30 г.) чак. выканан.	За 5 год па пяцігодцы	Выкананьне 5-цігодкі у $3^1/_4$ гады
1.808	1.500	8.994*)	16.847	16.921	99,6

Заўвагі: Капіталаўкладаньні ў 1931 г. па Аб'яднаньням „Будматар'ялы" і Шклоаб'яднаньню паказаны разам з укладаньнямі ў будуючыхся прадпрыемствах адышоўшыя да Саюзнай прамысловасьці: цэмэнтнаму—4.000 руб. і механічн. шклозаводу—4.400 руб.

ГАЛЯНТАРЭЙНАЯ


Валавая прадукцыя па цэн. 26-27 г. у тыс. руб.		
1928-29 г.	1931 г. Абсал.	192-33 г. па пяцігод. Абсал.
180	3.201	3.576

Сярэдне-гадав. сьпісачн. кольк. рабочых		
1928-29 г.	1930 г. Абсал.	1931 г. Абсал.
82	335	367

БЕЛТРАКТАРАЦЭНТР

РОСТ МТС

1930 год	6
1931 год	33
1932 год	72



РОСТ ТРАКТАРОЎ

1930 год	100
1931 год	1018
1932 год	2270


РОСТ УНОЎ ЗАСВОЕНЫХ ЗЯМЕЛЬ

1930 год	500 га
1931 год	10.000 га
1932 год	72.000 га

ПЕРШЫ САЮЗСЕЛЬТРЭСТ

	1930 г.	1931 г.
Выканана будаўніцтва	5.346.000	3.190.000
Колькасьць аб'ектаў .	433	[illegible].598
Рабсіла	2.500	15.000

Першы дзяржаўны трэст агульнасаюзнага значэньня па будаўніцтве ў аграмаджаным сэктары сельскай гаспадаркі







СЬВІНАВОД

Рух сьвінасаўгасаў, тэрыторыі і засеўных плошчаў

№№	Дата	Лік саўгасаў	Наяўнасьць ворыва ў *га*	Засеўная плошча
1	На 1-V—1930 г.	55	21.428	12.825
2	„ 1-I—1931 г.	72	40.351	34 922
3	„ 1-X—1931 г.	85	91.160	86.600

Рух рагатаи жывёлы

№№ п. п.	Дата	Наяўнасьць галоў
1	Па 1-V—1930 г.	7.316
2	„ 1-І—1931 г.	8.091
3	„ 1-X—1930 г.	10.336

Рух рабочай сілы

№№ п, п.	Дата	Наяўнасьць рабочых
1	На 1-І—1931 г.	2.423
2	„ 1-X „	9.026

Рух сьвіногa пагалоўя


№№ п. п.	Дата	Наяўнасьць агульнага пагалоўя	Здана таварн. галоў у *цнт*
1	На 1-V—1930 г.	3.197	—
2	„ 1-I—1931 г.	26.653	6,17
3	„ 1-X— „	71.965	10.515

Рух будаўніцтва сьвінарнікаў

№№ п. п.	Дата	Наяўнасьць гатовых сьвінамесц	Знаходзіцца ў пабудове	Разам
1	На 1-V—1930 г.	171	—	171
2	„ 1-X—1931 г.	28.187	44.258	72.445

Рух жывой і мэханічнай цягавай сілы

№№ п. п.	Дата	Наяўнасьць коняй	Трактары Лік	Трактары HP	Аўтомашын
1	На 1-V—1930 г..	2.336	—	—	—
2	„ 1-I—1931 г..	2.765	130	1.430	4
3	„ 1-X— „	5.146	186	2.016	44



БЕЛЖЫЛСАЮЗ

	1925 г.	1926 г.	1927 г.	1928 г.	1929 г.	1930 г.
Агульны абарот Белжылсаюзу на матэрыялах і будаўніцтве . .	—	417	1.552	3.375	6.793	7.500
Дынаміка росту сеткі ЖАКТ'аў .	101	140	126	82	69	56
Дынаміка росту членау ЖАКТ'аў.	5.958	8.835	11.598	12.926	16.400	33.300
Дынаміка росту арэндаванай жылплошчы (у тыс. *кв. м*) . . .	268,3	324,8	375,1	420 5	470	968
Выдана на рамонты (у тыс. руб.).	523,1	879,9	1.309.9	926,9	1.190	2.000
Дынаміка росту сеткі ЖБКТ . .	43	72	80	63	53	51
Дынаміка росту членаў ЖБКТ. .	2.285	3.546	4.219	4.347	4.750	9.200
Заселена новапабудаванай плошчы (у *кв. м*).	9.100	14.900	20.800	18.400	17.300	11.500
Выдана на будаўніцтва па БССР (у тыс. руб.)	1.066	1.730,4	2.400	1.775 2	2.437	3.5.0

БЕЛКООП САЮЗ

Выпуск агулавай прадукцыі у млн. руб.

1928-29	34,8
1929-30	58,2
1930-31	139,1

Колькасьць членаў арцеляй

1928	18.021
1929	33.858
1930	37.302
1931	50.632



КАПІТАЛЬНЫЯ ЎКЛАДАНЬНІ

1928-29	350.000
1929-30	2.100.000
1930-31	6.300.000

БЕЛСАЎГАСТРЭСТ

Асноўныя паказальнікі саўгасаў Белсаўгастрэсту

	Гады 1930	1931
Колькасьць саўгасаў	87	101
Агульная зямельная плошча ў *га*	89.490	163.000
У тым ліку ворыва ў *га* . . .	35.344	61.233
. . . сенажаці ў *га*. . .	22.421	58.622
Сярэдні разьмер саўгасаў . . .	1.028	1.620
Агульная засеўная плошча . .	27.128	51.357
Буйнай рагатай жывёлы . . .	20.125	41.378
Прыпадае буйнай рагатай жывёлы на 1 саўгас.	231	4.095

	Гады 1930	1931
Лік трактараў	94	230
Мэханізацыя паляводзтва . . .	27,6%	49%
Лік крухмальных заводаў . . .	19	13
Атрымана сухога крухм. тон .	3.894 4	4.862
Становішча асноўных капіталаў у тыс.	5.206,3	11.444,0
Лік рабочых	6.306	8.949
Агуловая прадукцыя ў тыс. руб.	10.806	23.961
Таварная прадукцыя ў тыс. руб.	—	22.591



РЭАЛІЗАЦЫЯ МАСАВЫХ ПАЗЫК І АШЧАДСПРАВА Ў БССР




РЭАЛІЗАЦЫЯ МАСАВЫХ ПАЗЫК У БССР

НАЗВА ПАЗЫК	РЭАЛІЗАВАНА (у тыс. руб.).					
	Сярод рабочых і служачых	Сярод сялян	Іншага насельніцтва	Разам па БССР	У тым ліку	
					Горад	Вёска
10% пазыка 1927 год	403	—	627	1030	1030	—
%% суадносіны	39,1	—	60,9	100,0	100,0	—
Пазыка ўзмацн. сел. гасп.	374	1860	152	2380	526	1860
%% суадносіны	15,7	77,9	6,4	100,0	22,1	77,9
1-я пазыка індустрыял.	1905	243	554	2702	2459	243
%% суадносіны	70,6	8,9	20,5	100,0	91,1	8,9
2-я паз. індустрыял.	8464	646	1154	10264	9618	646
%% суадносіны	82,5	6,3	11,2	100,0	93,7	6,3
3-я паз. індустрыял.	14792	1728	1451	17971	16243	1728
%% суадносіны	82,3	9,6	8,1	100,0	90,4	9,6
Пазыка „Пяцігодка ў 4 гады"	15291	3437	1347	20075	16638	3437
%% суадносіны	76,2	17,1	6,7	100,0	82,9	17,1
Пазыка „3-ці рашаючы"	26454	8264	2719	37437	29173	8264
%% суадносіны	70,7	22,0	7,3	100,0	78,0	22,0
РАЗАМ	67683	16178	8004	91865	75687	16178
%% суадносіны	73,7	17,6	8,7	100,0	82,4	17,6




АШЧАДСПРАВА У БССР у тысячах руб.

КОЛЬКАСЬЦЬ УКЛАДЧЫКАЎ У ТЫСЯЧАХ



АСТАЧА УКЛАДА У ТЫСЯЧАХ РУБЛЁЎ



ЗЬВЕСТКІ АБ КОЛЬКАСЬЦІ УКЛАДАЎ І УКЛАДЧЫКАЎ У АШЧАДКАСАХ БССР (у тыс). ка 1931 год.

Колькасьць укладчыкаў	Астача укладаў	Колькасьць ашкакас
586,6	21690,9	1565



„Организацыйна-гаспадарчае замацаваньне колгасаў — цэнтральная задача.

Толькі такім шляхам, шляхам правільнай арганізацыі грамадзка-колгаснай працы будзе па-сапраўднаму перавыхоўвацца ў колгасах учорашні дробны ўласьнік, толькі такім шляхам будуць у арцелях (с-г.) складацца новыя адносіны да працы“ (Якаўлеў).

БІБЛІОТЭЧКА ПА ОРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАМУ ЎМАЦАВАНЬНЮ КОЛГАСАЎ.

		ЦАНА
1.	**У. А. Караў.** „Як выкарыстаць конную цягу з трактарам	15 к.
2.	**Хаванскі.** Утрыманьне і выкарыстаньне каня	40 „
3.	**М. Іваноў.** Асновы кармленьня с-г. жывёлы	22 „
4.	**П. Палескі.** Чарговыя задачы разьвіцьця сьвінагадоўлі ў калгасах БССР	20 „
5.	**Навумаў.** Гадоўля і выкармліваньне цялят	15 „
6.	**Арлоўскі.** Організацыя групавога кармленьня кароў	12 „
7.	**Асіпава.** Што павінна ведаць даільшчыца	10 „
8.	**Кіпрыянец.** За вынаходзтва, рацыяналізатарства і масавыя догляды ў сьвінагадоўлі	15 „
9.	**Я. Варкуноў.** Аб парадку скармліваньня і сіласаваньня кармоў	3 „
10.	**Клюеў.** Тэхніка вядзеньня малочнай гаспадаркі	80 „
11.	**Дзьмітрыеў.** Азбука лугаўніцтва	25 „
12.	**Іванюк.** Палепшаньне насеннага матэрыялу	12 „
13.	**Кісялёў.** Сейце бабовыя расьліны	5 „
14.	**Вільямс.** Проблема ўраджайнасьці	10 „
15.	**Зборнік.** Як організаваць працу ў ільнаводных колгасах	15 „
16.	**Зборнік.** За пашырэньне плошчы і ўздым ураджайнасьці ільну і канапель	10 „
17.	**Апрэсянц.** МТС і колгасы	10 „
18.	**Іваноў.** За зьдзельную працу ў колгасах	5 „
19.	**Зборнік.** Як організаваць працу ў колгасах	12 „
20.	**Зборнік.** За правільны колгасны ўлік	12 „
21.	**В. Удалаў.** Вытворчыя нарады ў колгасах	15 „
22.	**Зборнік.** Улік у колгасах	20 „
23.	**Зборнік.** Комсамол за аўладаньне агротэхнікай	32 „
24.	**Новік.** У барацьбе за колгасныя кадры	30 к.
25.	**Герасімаў.** Аўладай тэхнікай колгаснай вытворчасьці	7 „
26.	**Рассаднікаў.** Рабочыя рукі социялістычнаму будаўніцтву	5 „
27.	**Шустаў.** Як організаваць зьдзельную работу ў колгасах	15 „
28.	**М. Хаеў.** Раньняе вырашчваньне гародніны і рассады	25 „
29.	**Зборнік.** Як захоўваць насеньнікі капусты і корняплодаў	7 „
30.	**Александраў.** Першая дапамога ў няшчасным выпадку і раптоўных хваробах коняй	12 „
31.	**Александраў.** Першая дапамога буйнай рагатай жывёле	12 „
32.	**Ліўшыц.** Трыхіноз сьвіней і меры барацьбы з ім	14 „
33.	**Ліўшыц.** Хваробы сьвіней і меры барацьбы з ім	15 „
34.	**Ціон.** Што трэба ведаць сьвінару па вэтэрынарыі	15 „
35.	**Скіба.** Памятка лесазагатоўшчыка	22 „
36.	**Круглоў.** Выканаем пляны па сац. жывёлагадоўлі	20 „
37.	**Кудзінаў.** Адзін з лепшых (разьмеркаваньне даходаў у калгасе) 2,5 арк.	15 „
38.	**Кудзінаў.** Колгас „Новы шлях“ (папярэдняе разьмерк. даходаў 1931 г.)	15 „
39.	**Залескі.** Разьмеркаваньне даходаў па працаднёх	15 „
40.	**Байкоў.** Разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю ў калгасах	22 „
41.	**Зборнік.** Змаганьне за ўраджай. За вытворчае ўмацаваньне калгасаў. 3 друк. арк.	15 „
42.	**Зборнік.** Тэхніка сьвінагадоўлі ў масы	10 „


УСЯ БІБЛІАТЭЧКА КАШТУЕ 7 РУБ.

КНІГІ ПРАДАЮЦЦА ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ ДЗЯРЖАЎНАГА ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ, СПАЖЫЎКООПЭРАЦЫІ І САЮЗДРУКУ.

Калі ў кнігарні ня будзе якіх-небудзь кніжак, то шліце заказ кнігапоштай па адрасу:

МЕНСК, РОГ САВЕЦКАЙ І ЛЕНІНСКАЙ ФІЛІАЛ ДВБ.

Менск. Друк. імя Сталіна. Зак. № 2405. 7.500 экз. Галоўлітбел № 1031.



МЕНБУД

ВАЛАВАЯ ПРАД

ПА САБЕКОШТУ (У ТЫС. РУБ.)

	26-27	27-28	28-29	АСОБ. КВ.	30	1931	1932
	1392	1525	2731	1530	5596	6623	11450
З ІХ ПА БУДАЎНІЦТВУ	1077	1125	2200	1300	4520	5000	8000

РАБСІЛА

26-27	27-28	28-29	АСОБ. КВ.	1930	1931	1932
528 ч.	455 ч.	706 ч.	1607 ч.	2128 ч.	1750 ч.	2903 ч.

БЕЛКАМУНБАНК

УКЛАДАНЬНІ Ў БУДАЎНІЦТВА БССР

ВЫДАНА (У ТЫС. РУБ.)

	27-28	28-29	29-30 І АС. КВ.	1931 ПА ПЛЯНУ
ЖЫЛБУДАЎНІЦТВА	5113,5	6546,4	9712,3	19450,0
КАМУН. БУДАЎНІЦТВА І МЯСЦ. ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ	3676,1	10226,7	13974,2	24396,0

